РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 мая СЕРАДА № 91 (30479)

УСТУПНАЯ КАМПАНІЯ — 2025

# ДЛЯ МЭТАНАКІРАВАНЫХ І МАТЫВАВАНЫХ

## Якія ўмовы паступлення ва ўстановы адукацыі чакаюць сёлета алімпіяднікаў і мэтавікоў



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Пераможцаў і лаўрэатаў алімпіяд справядліва называюць залатым фондам краіны. Права паступіць у ВНУ яны заваёўваюць упартай працай і грунтоўнымі ведамі, якія пацвярджаюцца высокімі адзнакамі на інтэлектуальных спаборніцтвах розных узроўняў. Тое ж можна сказаць і пра маладых людзей, якія становяцца «зоркамі» конкурсаў прафесійнага майстэрства. Аднак не варта лічыць, што прэферэнцыі ва ўступнай кампаніі атрымлівае кожны з іх. Штогод Мінадукацыі вызначае, пераможцам якіх алімпіяд і конкурсаў прафмайстэрства сёлета не давядзецца здаваць экзамены пры паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны. СТАР. 6–7

ШТО ЗМЯНІЛАСЯ Ў ПРАВІЛАХ АЎТАПЕРАВОЗАК? 6



ВЫРАТАВАНАЯ ПАМЯЦЬ



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ВЕКАПОМНАЕ

# ПРАДАЎЖАЛЬНІКІ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

## Патрыятычная экспедыцыя «Непакораныя» працягнула маршрут па Беларусі

Удзельнікі экспедыцыі ўсклалі кветкі да стэлы «Мінск — горад-герой» у сталіцы нашай краіны і ў мемарыяльным комплексе «Курган Славы» пад Мінскам, дзе разгарнулі самую вялікую ў свеце копію Сцяга Перамогі.

Экспедыцыя «Непакораныя» стартавала 12 мая ля сцен Брэсцкай крэпасці. Маршрут ахопіць 14 гарадоў Беларусі і Расіі.

— Да 80-годдзя Вялікай Перамогі па ініцыятыве Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расіі стартаваў унікальны патрыятычны маршрут. Моладзь прапанавала ідэю, а старэйшыя таварышы яе падтрымалі. Удзельнікі будуць спыняцца ў ключавых гістарычных пунктах, наведваць памятныя мясціны, аддаючы даніну памяці героям, — расказаў **член Савета Рэспублікі, першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ.**

СТАР. 5



ISSN 1990 — 763X

25091>

9 771990 763008

АФІЦЫЙНА

# УДАСКАНАЛЕННЕ І ЎПАРАДКАВАННЕ

## Прэзідэнт Беларусі падпісаў Закон аб рыэлтарскай дзейнасці.

Падрыхтоўка дадзенага акта была абумоўлена неабходнасцю комплекснага ўрэгулявання адносін, звязаных з аказаннем рыэлтарскіх паслуг.

Законам ствараецца новы орган самакіравання — Палата рыэлтараў. У яе структуру ўключаюцца агульны сход (сход упаўнаважаных), праўленне, старшыня і рэвізійная камісія.

Скасоўваецца інстытут агентаў па аперацыях з нерухомасцю. Правам аказання рыэлтарскіх паслуг будуць валодаць толькі рыэлтары, якія з'яўляюцца членамі Палаты рыэлтараў і якія маюць пасведчанне аб атэстацыі.

Змяняюцца таксама падыходы да кваліфікацыйных патрабаванняў рыэлтараў, у прыватнасці, адмяняецца патрабаванне аб наяўнасці профільнай адукацыі. Рыэлтарам зможа стаць грамадзянін з любой вышэйшай адукацыяй, які прайшоў навучальныя курсы ў сферы нерухомасці і здаў атэстацыйны экзамен.

ПАРАДАК ДНЯ

# «СТВАРЫЦЬ КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНЫ ПРАДУКТ»

## Аляксандр Турчын аб сумесных зборачных вытворчасцях у В'етнаме

На сумесных зборачных вытворчасцях трактароў і тэхнікі МАЗ у В'етнаме важна стварыць канкурэнтаздольны прадукт. Такое меркаванне выказаў Прэм'ер-міністр Беларусі Аляксандр ТУРЧЫН падчас перагавораў з Генеральным сакратаром Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі В'етнама То Ламам у Мінску, якія прайшлі ў панядзелак, 12 мая.

Аляксандр Турчын адзначыў, што многія пытанні двухбаковага супрацоўніцтва былі абмеркаваны ў тым ліку падчас сустрэчы на Мінскім трактарным заводзе. Ён таксама выказаў падзяку То Ламу за адкрыты дыялог.

— На сустрэчы з кіраўніком нашай дзяржавы ўсе аспекты беларуска-в'етнамскага супрацоўніцтва былі падрабязна абмеркаваны. Я б хацеў прапанаваць рэалізаваць тыя дамоўленасці, якіх мы дасягнулі на МТЗ. Стварэнне сумеснага прадпрыемства па зборцы беларускай тэхнікі ў В'етнаме з пастаўкамі на рынкі трэціх краін — гэта цудоўная ідэя. Гэта стане яркім прыкладам беларуска-в'етнамскага супрацоўніцтва, — лічыць прэм'ер.

Кіраўнік беларускага ўрада запэўніў высокага госця, што ўсё неабходнае для рэалізацыі гэтага праекта будзе зроблена.

— Для нас гэта таксама вельмі важнае пытанне. Мы хочам, каб у сяброўскай нам краіне, у В'етнаме, было сумеснае прадпрыемства, прадукцыя якога магла б ісці як на ўнутраны рынак, так і на знешні, — падкрэсліў Аляксандр Турчын. — Важна стварыць канкурэнтаздольны прадукт, які будзе канкурыраваць не толькі на рынку В'етнама, але і на рынку трэціх краін.

**Паводле БелТА.**

АКЦЭНТЫ

# МІНСК — ХАНОЙ: СТРАТЭГІЧНЫЯ ПАРТНЁРЫ

## «В'етнам прадстаўляе сур'ёзнае акно магчымасцяў для Беларусі»: эксперты — пра карысць супрацоўніцтва паміж краінамі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка днямі правёў перагаворы з Генеральным сакратаром Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі В'етнама То Ламам. Што агульнага паміж нашымі краінамі і ў чым плюсы ад узаемнага партнёрства, разважалі нашы эксперты.

### НОВЫ «АЗІЯЦКІ ТЫГР»



У эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа Радыё» **дэкан факультэта журналістыкі БДУ палітолаг Аляксей БЯЛЯЕЎ** адзначыў, што ўзаемадзеянне з В'етнамам вельмі важнае:

— Беларусь і В'етнам — краіны, якія шмат у чым аб'яднаныя на ідэалагічнай глебе. Мы ўсе выйшлі з сацыялістычнага лагера. У азіяцкіх краінах, а таксама ў Беларусі беражліва захоўваюць савецкую сацыялістычную спадчыну, да ліку якой адносіцца, у прыватнасці, кіраваная планавая эканоміка. І гэта вельмі важна. Мы бачым, што сёння В'етнам называюць «новым азіяцкім тыграм».

Палітолаг ацаніў каштоўнасць візіту Генеральнага сакратара Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі В'етнама:

— У нас быў не прэзідэнт В'етнама, а кіраўнік адзінай і кіруючай у краіне Камуністычнай партыі. Партыйнае кіраўніцтва ў В'етнаме прымае стратэгічныя рашэнні. Гаворка ідзе аб стратэгічным партнёрстве: мы заключаем дагавор з кіраўніком партыі, якая сёння надзейна стаіць на чале В'етнама.

Што тычыцца плюсаў двухбаковага ўзаемадзеяння, палітолаг адзначае, што В'етнам — дзяржава, якая дынамічна развіваецца, мае вельмі шмат пунктаў росту:

— В'етнам валодае вельмі выгадным геаграфічным становішчам, гэта краіна з працяглай берагавой лініяй, а марскі гандаль больш танны, чым гандаль па жалезных або аўтамабільных дарогах, аэрагандаль. Для нас вельмі важна, што з пункту гледжання лагістыкі В'етнам зручны. Таксама гэта краіна традыцыйных заняткаў: у яе вельмі моцным з'яўляецца аграрны сектар, і гэта аб'ядноўвае Беларусь і В'етнам. Мы разумеем праблемы адно аднаго, таму што ў нас таксама аграрны сектар дае немалую частку ВУП.

Аляксей Бяляеў акцэнтаваў увагу на тым, што В'етнам мае эканоміку, якая хутка расце:

— Яна за 2024 год прадэманстравала рост ВУП больш чым на 7 %, гэта тэндэнцыя захоўвалася і ў папярэднія гады. Але пры гэтым там яшчэ ёсць да чаго імкнуцца. Узровень жыцця простых в'етнамцаў не ўсюды высокі, і Беларусь можа прапанаваць свае высокія сацыяльныя стандарты. В'етнам зацікаўлены ў развіцці інфраструктуры, у стварэнні дарог і сацыяльных аб'ектаў. Там цяпер актыўна развіваецца будаўнічая галіна, а беларусы вельмі актыўна ўдзельнічаюць у будаўніцтве за мяжой, таму для нас гэта таксама акно магчымасцяў. І атрымліваецца такая ўзаемная выгада. Нас прыцягвае тое, што в'етнамцы глядзяць на беларусаў як на сяброў, у нас няма палітычных праблем.

### ЯКАСНА НОВЫ ЎЗРОВЕНЬ АДНОСІН



Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Сяргея АЛЕЙНІКА,** за 33 гады з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін Рэспублікі Беларусь і Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам выбудаваны шматузроўневыя, добрыя і сяброўскія адносіны.

— Візіт Генеральнага сакратара В'етнама ў нашу краіну азнаменаваў сабой пераход на якасна новы ўзровень нашых адносін, — удакладніў ён. — Прынята заява кіраўнікоў аб вывядзенні нашага супрацоўніцтва на ўзровень стратэгічнага партнёрства, што падкрэслівае асаблівы характар нашых адносін, шматграннасць нашага ўзаемадзеяння і ў эканоміцы, і ў палітыцы, і ў сацыяльна-гуманітарнай сферы.

Сенатар праінфармаваў, што падчас сустрэчы спікераў Нацыянальнага сходу з Генеральным сакратаром Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі В'етнама былі абмеркаваны перспектывы развіцця і пашырэння міжпарламенцкага дыялогу і супрацоўніцтва.

— Дамовіліся ў рэчышчы прынятай заявы абнавіць і падрыхтаваць да падпісання новае пагадненне аб міжпарламенцкім супрацоўніцтве з улікам бягучых актуальных рэалій сучаснага геапалітычнага этапу развіцця, бо папярэдняе пагадненне было падпісана ў 2009 годзе і ўжо ў некаторай ступені састарэла, — канкрэтызаваў ён.

Таксама ёсць дамоўленасць аб развіцці адносін па лініі груп дружбы, якія існуюць у парламентах абедзвюх краін.

— Асаблівую ўвагу ўдзялілі міжрэгіянальнаму супрацоўніцтву, — канстатаваў Сяргей Алейнік. — Падпісана і дзейнічае 13 пагадненняў паміж рэгіёнамі Рэспублікі Беларусь і Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам. Усяго 58 рэгіёнаў у В'етнаме. Мы дамовіліся пастарацца прыкласці намаганні для таго, каб пашырыць геаграфію нашага міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, якое прынясе дадатковыя дывідэнды для нашага міждзяржаўнага ўзаемадзеяння, дазволіць нам і павялічыць гандлёва-эканамічныя адносіны, і ўзмацніць нашы сувязі ў сацыяльна-гуманітарнай сферы.



У сваю чаргу **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах, кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентам Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам Алег ДЗЯЧЭНКА** канстатаваў, што дзелавое супрацоўніцтва паміж парламентамі Беларусі і В'етнама развіваецца паспяхова:

— Узаемныя візы кіраўніцтва Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага сходу Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам, двухбаковае ўзаемадзеянне на міжнародных пляцоўках, у прыватнасці ў ЕАЭС і АСЕАН, міжпарламенцкае супрацоўніцтва, удзел афіцыйных прадстаўнікоў парламента ва ўрачыстых мерапрыемствах, прысвечаных важным падзеям і датам у гісторыі дзяржавы нашых краін, узаемная падтрымка на міжнароднай арэне ў пытаннях абароны суверэнітэту і незалежнасці дзвюх дзяржаў, абмен вопытам заканатворчай дзейнасці, уклад у агульную справу захавання гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага і в'етнамскага народаў і многае іншае з'яўляецца падмуркам для далейшага развіцця міжпарламенцкіх адносін, напаўнення іх новым зместам з улікам чарговых цывілізацыйных выклікаў.

Ён паведаміў, што па лініі супрацоўніцтва парламенцкіх груп дружбы праведзены анлайн-сустрэчы дэпутатаў, абмеркаваны пытанні садзейнічання рэалізацыі дагавораў, дасягнутых на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў і парламентаў.

— Адным словам, вызначаны стратэгічныя напрамкі развіцця міжпарламенцкіх сувязяў і пастаўлены канкрэтныя задачы, якія патрабуюць вырашэння ў бягучым годзе, — акцэнтаваў увагу парламентарый.

### АСНОВА ДЛЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА — КАЛАСАЛЬНАЯ



На думку **члена Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве генеральнага дырэктара Гомельскага гандлёва-вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Фармацыя» Людмілы САПЕГА,** гістарычны візіт в'етнамскай дэлегацыі сведчыць аб тым, што Беларусь выходзіць на новы ўзровень у адносінах з так званымі «азіяцкімі тыграмі», да ліку якіх, безумоўна, належыць В'етнам. Пры гэтым парламен-



тарый нагадвае, што сяброўскія сувязі паміж народамі ўстанавілі даўно, яшчэ ў часы в'етнама-амерыканскай вайны 1964—1975 гадоў, у якой В'етнам атрымаў перамогу шмат у чым дзякуючы дапамозе савецкіх, у тым ліку беларускіх, ваенных спецыялістаў. У наступныя гады БССР аказвала В'етнаму садзейнічанне ў аднаўленні разбуранай народнай гаспадаркі, навучанні нацыянальных кадраў для прамысловасці, абароны, сельскай гаспадаркі.

— Таму падпісаныя ў Мінску дакументы па ўмацаванні ваеннага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі, сумесным развіцці лічбавых тэхналогій, узаемадзеянні ў галіне фармацэўтыкі, машынабудавання, а таксама аб супрацоўніцтве паміж вядучымі тэлерадыёкампаніямі дзвюх краін можна разглядаць як далейшае развіццё даўніх традыцый узаемадапамогі і шчырай дружбы паміж беларускім і в'етнамскім народамі, — падкрэслівае сенатар.



З калегай-парламентарыем салідарны **член Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Сяргей КЛІШЭВІЧ,** які звяртае ўвагу на тое, што Беларусь і В'етнам маюць трывалую гістарычную базу для супрацоўніцтва:

— У нас ёсць агульная, вельмі шчыльная гісторыя ўзаемадзеяння. Мы вельмі падобныя ментальна: і в'етнамцы ў 1960—1970-я гады, як і беларусы ў гады Вялікай Айчыннай вайны, гераічна змагаліся, супраціўляючыся амерыканскай агрэсіі. І беларускія ваенскоўцы ім у гэтым дапамагалі, за што В'етнам нам дагэтуль удзячны. Любыя візіты ў Беларусь дзяржаўных, палітычных дзеячаў не абыходзяцца без сустрэч з ветэранамі. Акрамя таго, Беларусь аказвала садзейнічанне В'етнаму і ў аднаўленні пасля вайны. Сёння гэта 32-я эканоміка свету. Невыпадкова на в'етнамскіх грашах намаляваны трактар «Беларус». Гэта таксама гістарычна вядомы факт.

Дэпутат падкрэсліў, што аснова для супрацоўніцтва Беларусі і В'етнама каласальная.

— Мы павінны выкарыстоўваць усё для таго, каб рэалізаваць гэты патэнцыял ужо на сучасным этапе, — дадаў Сяргей Клішэвіч. — У тым ліку эканамічным шляхам дапамагчы адстаяць нацыянальныя інтарэсы Беларусі і В'етнама. Мы бачым спробы ўмяшання ў нашы ўнутраныя справы. Мы ведаем, што В'етнам таксама пастаянна сутыкаецца са спробамі знешняга ціску. Гэта цеснае эканамічнае супрацоўніцтва, безумоўна, дазволіць нам умацаваць наш суверэнітэт і незалежнасць — так, як гэта было гістарычна ва ўзаемаадносінах паміж нашымі дзяржавамі.

**Маргарыта ЗАРОЎКІНА, Вераніка КАНЮТА.**

НАША ГІСТОРЫЯ

# «ЯГО СЛОВЫ НІКОЛІ НЕ РАЗЫХОДЗЯЦЦА СА СПРАВАЙ»

## Шклаўчане пра славутага земляка на прэзентацыі кнігі «Наш Прэзідэнт»

Дакументальна-біяграфічны нарыс «Наш Прэзідэнт» прэзентавалі на радзіме кіраўніка дзяржавы ў Шклове. Размова сярод землякоў атрымалася цёплай і душэўнай: было шмат аповедаў і добрых успамінаў, усмешак і авацый у адрас аўтарскага калектыву кнігі, перадае карэспандэнт БелТА.




Выданне прэзентавалі ў розных гарадах, але ўпершыню — на шклоўскай зямлі, дзе Прэзідэнта ведаюць і адчуваюць як нідзе, бо менавіта тут ён пачынаў свой жыццёвы і працоўны шлях. Ён запомніўся сваім землякам строгім, але справядлівым, а яшчэ — працавітым і мэтанакіраваным. Так, калі Аляксандр Лукашэнка ўзначаліў саўгас «Гарадзец» Шклоўскага раёна, гаспадарка была ў сумным стане: ні дарог, ні добрых ферм, ні кармоў, ні надояў. Зарплату людзі атрымлівалі праз раз, а моладзь нават і не думала заставацца тут працаваць.

Намаганнямі будучага Прэзідэнта ўсё змянілася, і справы ў саўгасе пайшлі ўгару. Сведкам гэтага быў даяр **Віктар Петакоў,** які адпрацаваў тут 45 гадоў. На прэзентацыі ён з непадробнай цікавасцю гартаў старонкі новай кнігі і ўсміхаўся, успамінаючы ранейшыя часы і ўбачыўшы знакавыя твары на здымках.

> **«Аляксандр Рыгоравіч адразу прыйшоў да нас як гаспадар, і ўсё стала мяняцца: падсыпалі дарогі, пачалі рамантаваць хлявы, бідоны з малаком перасталі насіць на сабе і сталі вазіць на калясках.**

Ужо ў першую зіму хапіла кармоў, а сянаж застаўся нават на лета. Да ўсіх пытанняў ён падыходзіў з веданнем справы, і ўсе яго шанавалі: ён сам быў рабацяга, шмат працаваў і ад іншых гэтага патрабаваў», — успамінае ён.

Віктар Аляксеевіч успамінае, што нават склаў прыпеўку пра новага кіраўніка і выканаў на адным са свят: «Лукашэнка да нас прыехаў з калгаса Леніна, і саўгас ён наш павёў па запаветах Леніна». «Аляксандр Рыгоравіч добра рэагаваў на маю творчасць, я ж спяваў і выступаў заўсёды, — усміхаецца працаўнік сельскай гаспадаркі. — Пазней, калі ён ужо быў дэпутатам, прыходзіў нават мяне паслухаць у Дом культуры імя Дзяржынскага».

Віктар Петакоў глядзіць на кнігу аб Прэзідэнце, якую трымае ў руках, і дадае: «Годны кіраўнік, такія Богам даюцца толькі раз. Ён не забывае сваю малую радзіму, імкнецца падтрымліваць і развіваць, каб людзі тут працягвалі жыць, каб моладзь не з'язджала. Яго землякі гэта бачаць і любяць яго за гэта. Мая маці, якой ужо 89 гадоў, кажа: «Беражыце Лукашэнку, калі яго не будзе — і толку не будзе».

Кніга выклікала непадробную цікавасць у мясцовых жыхароў: яшчэ за гадзіну да прэзентацыі выстраілася вялізная чэргі — кожны хацеў набыць яе для працоўнага калектыву, асабіста для сябе ці для бацькоў. Сярод першых пакупнікоў — **Кацярына Пятроўская,** дырэктар Александрыйскай сярэдняй школы, дзе вучыўся будучы кіраўнік дзяржавы. «У нашай школе знаходзіцца экспазіцыя, прысвечаная жыццю і дзейнасці Прэзідэнта, — адзначыла яна. — Дзякуючы гэтай кнізе мы можам удакладніць і зверыць пэўныя біяграфічныя моманты і дапоўніць свае экскурсіі. Лічу, што такая кніга павінна быць настольнай у кожнай установе адукацыі».

Кацярына Пятроўская падкрэсліла, што для беларускай моладзі важна расці на такіх прыкладах.

> **«Прэзідэнт заслужыў усенародную любоў тым, што асабіста паказвае, як трэба любіць сваю зямлю і людзей, якія тут жывуць.**

Яго словы ніколі не разыходзяцца са справай, і гэта дарагога варта. Мы бачым, як шмат ім зроблена для таго, каб мы жылі ў міры і камфортных умовах», — сказала яна.

Размову падхапілае дырэктар сярэдняй школы № 4 Шклова **Ірына Цызаль.** «Не магла прапусціць прэзентацыю, бо гэта магчымасць дакрануцца да гісторыі беларускай дзяржавы і біяграфіі нашага лідара, якога мы любім, паважаем і ганарымся тым, што мы — яго землякі, — падкрэсліла яна. — Ён вельмі моцны чалавек і лідар, які ў першую чаргу думае не аб сабе, а аб сваёй краіне і сваім народзе. А нам, простым людзям, важныя простыя каштоўнасці: каб быў мір, каб мы маглі бясплатна лячыцца, на працы плацілі заробак, а нашы дзеці вучыліся там, дзе хацелі».

**Вера Феафанаўна Кастэнка** 50 гадоў аддала кіручай рабоце, з якіх 17 з паловай працавала ў Шклоўскім раёне. Яна з гонарам зазначае, што Магілёўская вобласць адыграла вызначальную ролю ў развіцці краіны.

> **«У нас зараджалася дзяржаўнасць, таму што тут нарадзіўся першы Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка — чалавек асаблівай загартоўкі, з якім мне пашчасціла працаваць. Ён быў вельмі таленавітым і працавітым, быў увесь час у пошуку і мог мабілізаваць тых, хто знаходзіўся побач.**

Ён добра ведаў сяло, сялянскую працу, мог захапіць і скіраваць — гэтыя якасці ў яго былі заўсёды. У 33 гады ўзначаліць саўгас, тым больш у пераходны перыяд, — гэта вялікі дар кіраўніка».

**Генадзь Лаўранкоў** 14 гадоў адпрацаваў на пасадзе памочніка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектара па Магілёўскай вобласці. На прэзентацыі ён падкрэсліў, што гэтая кніга — не толькі 30-гадовая гісторыя прэзідэнцтва, але і праца, дзе можна прачытаць аб сваім земляку. «У яго заўсёды была пазіцыя: хто, калі не я, — успамінае суразмоўца.

> **— Чаму яго людзі паважаюць? Таму што заўсёды рабіў тое, што абяцаў. Ён заўсёды выказвае сваё меркаванне, да якога прыслухоўваюцца нават за мяжой, таму землякі яго падтрымліваюць і не пасмеюць падвесці.**

І на нас ляжыць адказнасць працаваць лепш за іншых, каб ніхто не сказаў, што нам патураюць».

Прэзентацыя кнігі на малой радзіме Прэзідэнта стала знакавай падзеяй як для ўсяго аўтарскага калектыву, так і для жыхароў Шклоўскага раёна. Сустрэча — добрая нагода абмяняцца ўспамінамі і падзяліцца ўражаннямі аб вядомым ураджэнцы шклоўскай зямлі. Адзін з аўтараў выдання — **доктар педагагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі Аляксандр РАДЗЬКОЎ** у свой час быў першым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі, міністрам адукацыі, а таксама рэктарам МДУ імя А. А. Куляшова — альма-матар кіраўніка дзяржавы. У размове са шклаўчанамі ён звярнуў увагу, што лідарства ў нашага Прэзідэнта — прыроджаная якасць, менавіта такі дар яму дастаўся ад прыроды.

«Зрабіць кнігу аб Прэзідэнце, з аднаго боку, — проста, таму што ўсё яго жыццё ў нас перад вачыма, з другога — складана, таму што неабходна перадаць яго рысы характару і іншыя асаблівасці, — адзначыў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА.** — Наш Прэзідэнт — гэта наша дзяржава, таму кніга адлюстроўвае не толькі жыццёвы шлях, але і развіццё ўсёй краіны».

Анатоль Ісачанка адзначыў, што яму, як і кіраўніку дзяржавы, давялося ўзначальваць саўгас «Гарадзец» Шклоўскага раёна. І людзі, з якімі ён працаваў, гаварылі аб адным: Прэзідэнт строгі, але заўсёды справядлівы. «У яго заўсёды прасочвалася такое трапяткое стаўленне да людзей разам з жорсткім патрабаваннем, — працягнуў ён. — І гэтая загартоўка кіраўніка з ім на працягу ўсяго жыцця. І сёння: нараўне з патрабаваннем — вельмі трапяткое і беражлівае стаўленне да нашых людзей. Прасочваючы ўвесь яго жыццёвы шлях, разумееш: прэзідэнтамі не нараджаюцца — прэзідэнтамі становяцца. І гэтая кніга чарговы раз пацвярджае гэтую думку».

**Прэс-сакратар Прэзідэнта Наталля ЭЙСМАНТ** падкрэсліла, што прэзентацыя кнігі «Наш Прэзідэнт» у Шклове асаблівая, бо сустрэча была ініцыіравана землякамі кіраўніка дзяржавы. Улічваючы, што ў раёне жыве шмат людзей, хто добра ведаў Аляксандра Лукашэнку асабіста і працаваў з ім, для творчага калектыву гэтым разам было важна не казаць, а менавіта слухаць. «У гэтых месцах мы заўсёды адчуваем Прэзідэнта па-асабліваму, — падкрэсліла яна. — На сваёй радзіме ён не такі, як у іншых кутках нашай краіны — з асаблівымі эмоцыямі і пачуццямі, адносінамі да гэтай зямлі. Уся гісторыя нашай краіны пачыналася адсюль, як і гэта кніга».

З НАГОДЫ

# «ПРАБЛЕМЫ З ГЛАБАЛЬНАЙ БЯСПЕКАЙ ЗВЯЗАНЫ З ДЭВАЛЬВАЦЫЯЙ СЯМЕЙНЫХ КАШТОЎНАСЦЯЎ»

## У Мінску прайшоў Міжнародны форум «Сям'я — аснова дэмаграфічнага патэнцыялу дзяржавы»

На ім прадстаўнікі ўрада, міністэрстваў і ведамстваў, праваслаўнай царквы абмеркавалі пытанні ўмацавання статусу сям'і і шлюбу, падрыхтоўкі моладзі да сямейнага жыцця, аховы здароўя сям'і, рэпрадуктыўнага здароўя жанчын і мужчын, развіццё ўмоў для эканамічнай самастойнасці і росту дабрабыту сям'і і, як вынік, павышэння нараджальнасці, што застаецца адным з найважнейшых складнікаў эфектыўнага сацыяльна-эканамічнага развіцця любой дзяржавы.



**Намеснік Прэм'ер-міністра Уладзімір КАРАНІК** расказаў пра дэмаграфічныя тэндэнцыі, якія характэрны не толькі для Беларусі і Расіі, але і ўсіх развітых краін свету.

> **— Пакуль у дзяржаве гучыць дзіцячы смех, у яе ёсць будучыня.**

На форуме мы абмяркоўваем, як змяніць пэўныя негатыўныя тэндэнцыі, якія характэрныя не толькі для Беларусі і Расіі, а і для многіх развітых краін, па зніжэнні нараджальнасці і забяспечыць рост насельніцтва. Сёння мы бачым у многіх развітых дзяржавах, што роўны доступ жанчын да атрымання адукацыі, прафесійнай дзейнасці, высокіх пасад, кар'ернага росту прыводзіць да таго, што яны адкладаюць на пасля час уступлення ў шлюб і нараджэння дзяцей, імкнучыся рэалізаваць сябе ў прафесійнай сферы і дасягнуць фінансавай незалежнасці. І той бяспечны ўзровень — мінімум 2,2 дзіцяці на адну жанчыну, які дазваляе забяспечыць дэмаграфічны рост, — не выконваецца практычна ні ў адной развітой краіне. У Паўднёвай Карэі гэта лічба ўвогуле меншая за 1. І ў многіх краінах гэты паказчык балансуе ад 1,1 да 1,7, — адзначыў віцэ-прэм'ер.

Ён падкрэсліў, што такія тэндэнцыі тлумачацца як развіццём эканомікі, так і дэвальвацыяй традыцыйных сямейных каштоўнасцяў, што таксама назіраецца ў многіх дзяржавах.

— Толькі моцная здаровая сям'я можа забяспечыць гарманічнае развіццё дзяцей і вырасціць годных членаў грамадства. Менавіта сям'я з'яўляецца важным элементам захавання гістарычнай памяці, нацыянальнай ідэнтычнасці. Наша задача і надалей імкнуцца да ўмацавання інстытута сям'і, — звярнуў увагу Уладзімір Каранік.

Ён нагадаў, што ў Беларусі робіцца вельмі многае для падтрымкі як маладых сем'яў, так і сем'яў з дзецьмі, асаблівая ўвага ўдзяляецца шматдзетным.

— Аднак мы бачым, што гэтыя меры (на этапе іх укаранення адзначаўся рост нараджальнасці) на сёння хоць і захоўваюць станоўчы ўплыў, але не прыносяць далейшага павелічэння нараджальнасці. Таму мы абмяркоўваем, якім чынам на інфармацыйным, заканадаўчым, эканамічным полі ўмацоўваць інстытут сям'і, захаваць традыцыйныя сямейныя каштоўнасці, стымуляваць нашу моладзь да нараджэння і выхавання дзяцей. Традыцыйныя сем'і — гэта той падмурак, абапіраючыся на які будучыя пакаленні будуць забяспечваць развіццё нашай краіны.

Уладзімір Каранік дадаў, што праблемы з глабальнай бяспекай, якія цяпер назіраюцца ў свеце, звязаны і з дэвальвацыяй сямейных каштоўнасцяў.

— Чалавек, які выхоўвае дзяцей, унукаў, мае крыху іншы погляд на жыццё: ён больш адказны і ніколі не зробіць таго, што можа паставіць пад пагрозу жыццё будучых пакаленняў, сваіх дзяцей і ўнукаў. Прывяду цытату маці Тэрэзы. Калі ў яе спыталі, што можна зрабіць для ўмацавання міру ва ўсім свеце, гэта мудрая жанчына адказала проста: «Ідзіце дадому і любіце сваю сям'ю». Чым больш у нас будзе шчаслівых дзяцей, любячых сем'яў, тым больш добрым стане наш неспакойны свет і тым больш бяспечным будзе наша жыццё і жыццё будучых пакаленняў, — рэзюмаваў намеснік Прэм'ер-міністра.

**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі ВЕНІЯМІН** адзначыў, што беларускія свяшчэннаслужыцелі зацікаўлены ў тым, каб у грамадстве адраджаўся духоўны падыход да погляду на сям'ю. Разам з тым сучасныя тэндэнцыі, характэрныя для многіх краін, не абмінулі і Беларусь.

— Негатыўны ўнёсак робяць каштоўнасныя ўстаноўкі і стэрэатыпы свядомасці, якія прапагандуюць адмову ад уступлення ў шлюб і нараджэння дзяцей. Гэта фарміруе эгаізм і нястрымнае спажыванне. Наўмысная адмова ад нараджэння дзяцей з эгаістычных памкненняў абясцэньвае шлюб. На жаль, сітуацыя з разводамі таксама застаецца сумнай. Часта людзі, якія ўступаюць у шлюбны саюз, не здольныя ствараць, праяўляць цярпенне, саступаць адно аднаму і думаць не толькі аб сваіх патрэбах, але і аб шчасці чалавека, якому яны давcovерыліся пры стварэнні сям'і. Разбурэнне сям'і мае неспрыяльныя наступствы для мужа і жонкі, дзяцей і ўсяго соцыуму. Мы бачым пэўную мяжу, да якой нельга набліжацца, і неабходна аб'яднаць намаганні розных міністэрстваў, ведамстваў і заканадаўчых органаў для распрацоўкі правільнага падыходу, што знойдзе водгук у маладых людзей і прынясе жаданы вынік, — сказаў мітрапаліт Веніямін.

**Намеснік Старшыні Дзяржаўнай Думы Расіі Ганна КУЗНЯЦОВА** адзначыла, што Беларусь і Расія сумесна выпрацоўваюць новыя рашэнні для ўмацавання статусу сям'і.

— Адна з найважнейшых задач — садзейнічаць абароне суверэнітэту ў каштоўнаснай сферы. Бо падтрымка сем'яў і ўдасканаленне сямейнай палітыкі ляжаць у аснове ўстойлівага развіцця, без гэтага немагчымы прагрэс ні ў якой іншай сферы. Настаў час разгледзець на ўзроўні Саюзнай дзяржавы стварэнне структур, камісій, рабочых груп, якія б займаліся выпрацоўкай парадыгмаў, рашэнняў у сферы дэмаграфіі, — адзначыла Ганна Кузняцова, дадаўшы, што сёння ў Дзярждуме Расіі ў прыярытэце законапраекты, накіраваныя на падтрымку сем'яў. Яна прапанавала стварыць мадэльны закон, які б дапамог нашым дзяржавам крок за крокам прымаць меры для ўмацавання статусу сям'і.

**Алена КРАВЕЦ.**

ЭКАНОМІКА

# З АКЦЭНТАМ НА РЭГІЁН

## У Магілёўскім аблвыканкаме падвялі вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця і выканання бюджэту вобласці за I квартал

Удзел у пасяджэнні прыняў Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, упаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта па Магілёўскай вобласці Дзмітрый КРУТОЙ, прадстаўнікі міністэрстваў і ведамстваў.



Як паведаміў у пачатку пасяджэння **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА**, вобласць па выніках першага квартала 2025 года выканала шэсць з дзевяці асноўных паказчыкаў. Аб'ём валавога рэгіянальнага прадукту за студзень—сакавік дасягнуў 4,5 мільярда рублёў у бягучых цэнах, але дасягнуць задання — 102,7 % — не атрымалася. Паказчык выканаЎны толькі на 102 %.

Дзмітрый Крутой адразу ж акцэнтаваў увагу на праблемных пытаннях.

— Асаблівую заклапочанасць выклікае сектар прамысловасці, — адзначыў ён. — Яго ўклад усяго толькі плюс 0,4 %. У нас экспартаарыентаваная эканоміка ў цэлым і доля экспарту прадукцыі для магілёўскіх прадпрыемстваў таксама вельмі высокая. Сітуацыя на расійскім, азіяцкіх рынках у першым квартале была сапраўды цяжкай для нашых экспарцёраў. Таму па шэрагу прадпрыемстваў назіраецца рост складскіх запасаў, зніжэнне чыстага прыбытку і рэнтабельнасці. І з-за гэтага ціск на інвестыцыйныя планы, якія даволі амбіцыйныя. Баланс бягучай дзейнасці і рэалізацыі інвестыцыйных праектаў для многіх прадпрыемстваў сёння стаў вельмі сур'ёзным выклікам і выпрабаваннем. І тыя стратэгіі, якія літаральна ў рэжыме анлайн даводзіцца распрацоўваць і разглядаць, прымаюцца для таго, каб ні ў якім разе не дапусціць сацыяльнай напружанасці.

Найбольш цяжкая сітуацыя на сёння складваецца ў сферы дрэваапрацоўкі і нафтахімічнага комплексу, падкрэсліў Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. Пасля аблвыканкама разгляд праблемных пытанняў прадоўжыўся на «Магілёўхімвалакне».

— Мне спадабалася, што менеджмент нашых прадпрыемстваў працуе ў рэжыме мабілізацыйнай эканомікі, як таго патрабуе Прэзідэнт, — адзначыў Дзмітрый Крутой. — Гэта не першы выпадак, калі ў нас дзесьці растуць інвестыцыйныя складскія запасы. Радуе, што мы наўпрост, не чакаючы ні года, ні двух гадоў, ні трох, гэтыя тэндэнцыі ўлоўліваем і тут жа на іх рэагуем, распрацоўваючы, можа быць, дзесьці сітуатыўныя, але правільныя метады рэгулявання.

На пасяджэнні была дадзена ацэнка вынікам сацыяльна-эканамічнага развіцця вобласці за першы квартал, унесены прапановы па павышэнні эфектыўнасці дзейнасці ва ўсіх галінах эканомікі і недапушчэнні павелічэння складскіх запасаў.

У дакладзе **старшыні камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама Аляксандра ВАРАПАЕВА** прагучала, што ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года прамысловымі прадпрыемствамі павялічана вытворчасць трактароў і машын для сельскай гаспадаркі, станкоў, цэменту, палімераў, піламатэрыялаў і гэтак далей.

У рэалізацыі плана мерапрыемстваў па імпартазамяшчэнні ў Магілёўскай вобласці было задзейнічана 140 суб'ектаў гаспадарання, у тым ліку 108 арганізацый малога і сярэдняга бізнесу. Вытворчасць імпартазамяшчальнай прадукцыі адбылася па 230 таварных пазіцыях. Аб'ём вытворчасці склаў 285 мільёнаў долараў пры заданні 281,3 мільёна.

Намінальная налічаная сярэднямесячная зарплата ў прамысловасці вырасла да 2276,7 рубля, або 117, 9 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. У цэлым па вобласці гэты паказчык склаў 2059,4 рубля, або 113,2 % да аналагічнага перыяду ў рэальным вылічэнні.

Узровень зарэгістраванага беспрацоўя на 1 красавіка назіраўся ў вобласці ў межах 0,1 % да колькасці працоўнай сілы. Па аператыўных даных гарраЙвыканкамаў, у студзені—сакавіку на новастворaныя працоўныя месцы працаўладкавана 649 чалавек.

У першым квартале на развіццё эканомікі і сацыяльнай сферы было выкарыстана за кошт усіх крыніц 983,8 мільёна рублёў інвестыцый, або 123,4 % у супастаўных цэнах да аналагічнага перыяду мінулага года пры заданні 101,9 %.

Увод у эксплуатацыю агульнай плошчы жылля склаў па вобласці 93,8 тысячы метраў квадратных, або 149,6 % да задання. Пабудавана 49 кватэр для шматдзетных сем'яў, 224 арэндныя кватэры, 50 кватэр сацыяльнага карыстання.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота БелТА.**

# ПРАДАЎЖАЛЬНІКІ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Беларускі парламентарый падкрэсліў, што ёсць сімвалы, якія аб'ядноўваюць цэлыя народы, і для постсавецкай прасторы такім сімвалам з'яўляецца Сцяг Перамогі. «Менавіта таму вельмі важнай кропкай эмацыянальнай, ідэалагічнай, патрыятычнай у рамках маршруту «Непакораныя» з'яўляецца разгортванне самага вялікага ў свеце Сцяга Перамогі. Калі маладыя людзі разгортваюць яго, яны адчуваюць сувязь пакаленняў. Адчуваюць сваю асаблівую адказнасць перад пакаленнямі-пераможцамі і перад будучымі пакаленнямі». Аляксандр Лук'янаў таксама падкрэсліў, што Курган Славы сімвалізуе гераізм беларускага і ў цэлым шматнацыянальнага савецкага народа.

«Вельмі важна, калі моладзь бачыць магчымасці для рэалізацыі сваіх ініцыятыў на такім узроўні, у такім маштабе. І калі людзі нешта робяць сваімі рукамі, яны гэта заўсёды будуць шанаваць і любіць, — звярнуў увагу сенатар Расійскай Федэрацыі Аляксандр Валошын. — Мемарыяльны комплекс «Саўр-Магіла», Брэсцкую крэпасць, Курган Славы аддзяляюць тысячы кіламетраў. Але ўсе яны аб'яднаны, таму што прасякнуты крывёй савецкага салдата, савецкіх грамадзян, якія абаранілі гэту зямлю, не шкадуючы ні жыцця, ні здароўя».

— Удзел у «Непакораных» — дзіўная магчымасць пабываць у месцах баявой славы, дзе кавалася Перамога, — падзяліўся Мікіта Тачылкін з Гомеля.

Ганна Баранікава з Таганрога захапляецца гісторыяй. Яна ўдзельнічае ў патрыятычных мерапрыемствах, супрацоўнічае з музеямі і ветэранамі.

— Раней я ніколі не была ў Беларусі. Калі прыехала сюды, адчула неверагодную атмасферу. Тут вельмі прыгожа, а людзі надзвычай адкрытыя і добразычлівыя, — адзначыла яна.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

**Фота ТК «Минская областьО главном».**

*Працяг тэмы на стар. 10*

АБМЯРКУЕМ

# ВЫХАВАННЕ НА ФУНДАМЕНТАЛЬНЫХ КАШТОЎНАСЦЯХ

## Што дапамагае моладзі знайсці правільныя арыенціры?

Маладзёжная палітыка — адзін з ключавых фактараў развіцця Беларусі. І маладыя людзі маюць магчымасць не проста актыўна дзяліцца сваімі меркаваннямі, але і ўдзельнічаюць у найважнейшых падзеях нашай краіны, ствараюць сучасныя праекты рознага кірунку, а таксама працягваюць місію захавання вялікага подзвігу нашага народа. На сустрэчы з журналістамі прадстаўнікі маладзёжных грамадскіх арганізацый расказалі пра знакавыя праекты, праграмы міжрэгіянальнага і міжнароднага ўзроўню, якія спрыяюць выхаванню ў моладзі патрыятызму, дазваляюць узмацняць сувязі паміж равеснікамі і пакаленнямі.

Як адзначыла **старшыня Цэнтральнай раённай арганізацыі г. Мінска РГА «Белая Русь» Галіна ГУЗОЎСКАЯ**, у тэме захавання гістарычнай памяці і выхавання любові да родных мясцін сур'ёзную ролю сёння адыгрываюць канструктыўныя грамадскія аб'яднанні.

— Сёлета напярэдадні Дня Перамогі наша грамадскае аб'яднанне «Белая Русь» і Міжнародны дзіцячы цэнтр «Артэк» падпісалі дагавор аб супрацоўніцтве. Гэта важны момант у міжнародным узаемадзеянні двух брацкіх народаў. На дадзены момант група дзяцей з Беларусі аздараўліваецца ў «Артэку». Для нас вельмі ганарова, што з'явілася магчымасць прадстаўляць рэспубліку ў такой усесаюзнай кузні творчых дзяцей. Найперш туды паехалі нашы актывісты, якія паспяхова заявілі аб сабе ў грамадскай дзейнасці. Гэта дзеці творчыя, адораныя. Яны прадстаўляюць сваю краіну, удзельнічаюць у розных рэспубліканскіх, міжнародных спаборніцтвах, конкурсах, праектах. І, мне здаецца, асабліва важна тое, што і ў «Артэку» яны расказваюць аднагодкам пра сваю Радзіму. Знаёмяць іх з магчымасцямі, якія ёсць тут для вучобы і развіцця, — дзеліцца Галіна Гузоўская. — Пятая змена там называецца «Гісторыя нашай Перамогі». І ў гэтым я якраз бачу асаблівы сімвалізм, таму што Перамога ў нас агульная. Менавіта яны — нашчадкі герояў. Нашы дзеці адвезлі з сабой у «Артэк» партрэты сваіх прадзедаў. І захоўваючы памяць пра іх, яны паказваюць сваю прыналежнасць да маладзёжнай палітыкі ў краіне.

Далучэнне маладых людзей да такіх праектаў дазваляе ім фарміраваць уласныя погляды на падзеі мінулага і ўсведамляць яго каштоўнасць. І тое, што наша дзяржава адкрытая ў тым ліку для ўзаемадзеяння з іншымі, каб разам выхоўваць моладзь на фундаментальных каштоўнасцях патрыятызму, любові да сваёй сям'і, малой Радзімы, краіны ў цэлым — дае маладым людзям імпульс для развіцця, матывуе іх актыўна ўдзельнічаць у грамадскім жыцці рэспублікі, дазваляе кожнаму быць пачутым.

— Патрыятычнае выхаванне заўсёды з'яўлялася і застанецца адным з важных кірункаў работы з моладдзю. Таму нам неабходна захаваць і перадаць гістарычную памяць і праўду. Пытанне «быць ці не быць» сёння не рытарычнае, — падтрымала калегу **старшыня Заводскай раённай арганізацыі г. Мінска РГА «Белая Русь» Святлана ЛЯОНЕНКА**. — Я хацела б прадставіць наш міжнародны патрыятычны праект «Вялікая перамога аб'ядноўвае народы», які існуе пяць гадоў. За гэты час мы правялі ў Беларусі каля сотні мерапрыемстваў, дзе было каля 25 тысяч удзельнікаў. Сярод іх вучнёўская, студэнцкая і працоўная моладзь, а таксама ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, ветэраны баявых дзеянняў, героі Беларусі і Расіі, грамадскія і палітычныя дзеячы, духавенства.

Таксама выступоўца адзначыла, што ў рамках плённага супрацоўніцтва на міжнародным узроўні праводзяцца навуковыя форумы, навукова-практычныя канферэнцыі, круглыя сталы, у ходзе якіх вялікая ўвага аддаецца захаванню гістарычнай памяці, духоўным каштоўнасцям, абаронцам Айчыны, бо ўсё гэта з'яўляецца асновай згуртаванасці ва ўмовах сучасных выклікаў. Сярод прыкладаў такіх мерапрыемстваў можна вылучыць рэспубліканскую акцыю «Вальс Перамогі», міжнародны культурна-асветніцкі праект «На подступах да Сталінграда», праект «Вялікая Перамога аб'ядноўвае народы» і іншыя.

У сваю чаргу **начальнік аддзела па рабоце з працоўнай моладдзю ЦК ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» Ганна САПОЦКАЯ** расказала пра ўдзел нашай краіны ў Міжнародным фестывалі-конкурсе патрыятычнай песні «Салдацкі канверт 2025». Ён прайшоў у Стаўрапалі (Расія).

— У Беларусі конкурс стартаваў яшчэ ў лютым і праводзіўся ў тры этапы: абласны, рэспубліканскі і непасрэдна міжнародны. У адрас арганізатараў паступіла парадку 400 заявак. Найлепшыя выйшлі ў фінал. На міжнародны этап конкурсу прыйшло каля 800 заявак, дзе для вочнага выступлення журы выбрала 13 выканаўцаў і 13 ансамбляў з Беларусі, Узбекістана, Грузіі, Арменіі і 15 рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі, — адзначыла Ганна Сапоцкая. — Па выніках конкурсу ў намінацыі «Салісты» краіну прадстаўляла Вольга Булай, якая стала лаўрэатам II ступені, а ў намінацыі «Вакальны ансамблі» — узорна-вакальная студыя «Эрыдан» заняла першае месца.

**Галоўны спецыяліст аддзела па рабоце з працоўнай моладдзю Цэнтральнага камітэта ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» Анастасія БАРЫТКО** падзялілася з прысутнымі інфармацыяй, якія праекты, прымеркаваныя да 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, БРСМ рэалізоўвае сёння ў інтэрнэт-прасторы. Адному з такіх старт далі якраз 9 Мая.

— Гэта рэспубліканскі праект «Да і пасля». Сутнасць яго заключаецца ў пошуку архіўных фота разбураной мясцовасці, пачынаючы з 1941 года і да цяперашняга часу. І ў стварэнні фота параўнальнага характару ў тым жа месцы, дзе паказана, што сёння там адбываецца. Фотаработы размяшчаюцца ў асабістых профілях удзельнікаў праекта з указаннем хэштэгаў. Найлепшыя работы пасля афармляюцца ў тэматычную выстаўку, якая будзе прэзентавана падчас нашых мерапрыемстваў да Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа 22 чэрвеня, — расказвае Анастасія Барытко.

Ёсць і іншыя праекты, якія БРСМ рэалізоўвае ў інтэрнэце. Напрыклад, Міжнародны інтэрактыўны гісторыка-патрыятычны праект «Лічбавая зорка». Запусцілі яго ў 2022-м у Год гістарычнай памяці. Быў створаны сайт, на якім тэрытарыяльныя камітэты БРСМ займаюцца алічбоўваннем інфармацыі пра памятныя мясціны. Пасля там з'яўляюцца таблічкі з QR-кодамі, якія дазваляюць перайсці на сайт і даведацца больш падрабязна пра пэўны аб'ект. За час праекта алічбавана інфармацыя пра больш як 2800 памятных мясцін. Сёлета да гэтай ініцыятывы далучылася Данецкая Народная Рэспубліка. Арганізатары спадзяюцца, што праект працягне і далей расці тэрытарыяльна. А значыць, прадоўжыцца важная работа...

**Алена ДРАПКО.**



Фота БелТА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Агат-электромеханический завод», 220114, г. Минск, пр-т Независимости, 115, каб. 317 |

**Предмет электронных торгов: оборудование (бывшее в употреблении), расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 115 (территория предприятия)**

| Лот № | Инв. номер | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **1** | 43376528 | Прибор для использования электрической прочности УПУ-10 | 3148,80 |
| **2** | 43376527 | Прибор для использования электрической прочности УПУ-10 | 3148,80 |
Возможно предоставление поэтапной оплаты предмета торгов (рассрочки платежа на срок до 6 месяцев) с первоначальным взносом не менее 20 % от цены продажи с учетом НДС с уплатой процентов за пользование средствами на фактическую сумму задолженности до ее погашения из расчета действующей на момент отчуждения ставки рефинансирования Национального Банка Республики Беларусь.
Обременения: Договоры аренды.
Капитальные строения с инвентарными номерами 250/С-1833 и 250/С-25204 расположены на земельном участке с кадастровым номером 243500000004000064 (площадь 0,1852 га).
Право постоянного пользования.
Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).
Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **27.05.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
14 мая 2025 г. № 17 (798)

# НЕ ЧУЖЫЯ ПРАБЛЕМЫ

**Як мясцовыя Саветы працуюць са зваротамі грамадзян**

Дэпутат — гэта той чалавек, якога добра ведаюць у вёсцы, горадзе, раёне. Той, хто сам, не па чутках, знаёмы з праблемамі населенага пункта, яго жыхароў. Той, да каго лягчэй за ўсё звярнуцца, можна проста пазваніць альбо прыйсці на прыём, сустрэць на вуліцы. Нашы карэспандэнты ў рэгіёнах сабралі прыклады паспяховага вырашэння пытанняў, рэалізацыі ініцыятыў менавіта мясцовымі Саветамі дэпутатаў.

## І СПАРТЫЎНАЯ ПЛЯЦОЎКА, І ДАРОГА

**Старшыня Ліноўскага сельскага Савета Пружанскага раёна Таццяна МАРДАНЬ** гаворыць, што мясцовая ўлада працуе са зваротамі грамадзян фактычна кожны дзень. Людзі прыходзяць не толькі ў дні прыёму, але і ў любы дзень. І неабавязкова са скаргамі, даволі часта прыходзяць з прапановамі. Менавіта з прапановы актывістак пярвічнай арганізацыі Беларускага саюза жанчын нарадзілася ініцыятыва ўсталяваць спартыўную пляцоўку ў парку.

— У сельсавеце стварылі ініцыятыўную групу па распрацоўцы праекта. Далі яму назву «Разам за здароўе ў аграгарадку», — працягвае распавед кіраўнік мясцовай улады. — Абгрунтавалі ў сваёй заяўцы жаданне аб'яднаць усе пакаленні жыхароў Лінова ў імкненні да ўмацавання здароўя і паляпшэння фізічнай формы. І праект атрымаў перамогу на конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў. Нам выдзелілі 60 тысяч рублёў, за якія былі набыты і змантаваны трэнажоры, а таксама абсталяванне і пакрыццё для воркаўт-пляцоўкі.

У аграгарадку, дзе пражывае больш за паўтары тысячы чалавек, пляцоўкай карыстаюцца падлеткі, людзі сярэдняга ўзросту, пенсіянеры.

Але ж найбольш зваротаў, паводле слоў старшыні сельскага Савета, утрымліваюць скаргі альбо просьбы. Так было, калі на сумесны прыём да дэпутата Палаты прадстаўнікоў Юрыя Наркевіча і дэпутата раённага Савета Васіля Казьмярчука прыйшла група бацькоў школьнікаў. Яны скардзіліся на праблемны ўчастак дарогі «Араб'і — Кутнявічы». Па гэтай дарозе штодня праходзіць школьны аўтобус. Дарога была зусім дрэннай — гэта мякка сказана. Асабліва пасля дажджу ў міжсезонне праехаць часам было вельмі не проста.

Да вырашэння праблемы падключыўся і Юрый Наркевіч. За работу ўзялася дарожна-будаўнічая арганізацыя. Асфальт там не паклалі, але дарогу выраўнялі, адраманталі, падсыпалі гравіем. І цяпер праблемныя раней два з паловай кіламетры сталі цалкам прыдатныя для руху на любым транспарце.

Тэму працягвае **дэпутат Пружанскага раённага Савета, дырэктар ААТ «Ліноўскае» Васіль КАЗЬМЯРЧУК:** «На нашы дарогі грэх наракаць. У Лінове яны добрыя. Варта сказаць словы падзякі спецыялістам ДРБУ-140, якія правялі вялікую работу за два апошнія гады па асфальтаванні і паляпшэнні нашых вуліц ды падтрымліваюць іх у належным стане. На вуліцах Дачная, Маладзёжная, Сонечная асфальт пракладзены цалкам. На вуліцах Вакзальная, Паркавая і Шырокая абноўлены ўчасткі дарогі».

Як не круці, дарогі найлепш характарызуюць узровень інфраструктуры. Каб яны былі дрэнныя, людзі наўрад ці так актыўна будаваліся б у аграгарадку і цана на жыллё не трымалася б стабільна высокай. А калі будуюць, набываюць, значыць, жыць тут камфортна. І дарога — у ліку першых складнікаў якасці жыцця вясковага чалавека, — падсумаваў Васіль Казьмярчук.

## ДАЛІ ПРЫРОДНЫ ГАЗ, ЧАКАЮЦЬ ЯКАСНУЮ ВАДУ...

Зашыр'е Ельскага раёна Гомельшчыны — аграгарадок вядомы. Населены пункт — візітная картка Ельшчыны. На слыху мясцовае культурнае жыццё: фальклорная дзейнасць, этнаграфія, краязнаўства... Але Зашыр'е — значны населены пункт для раёна і ў плане забеспячэння сацыяльнай інфраструктуры вяскоўцаў.

Аграгарадок адносіцца да аднаго з самых буйных на тэрыторыі Ельшчыны Старавысокаўскага сельсавета. У мінулым годзе Зашыр'е падключылі да прыроднага газу, тым самым забяспечылі больш зручныя і бяспечныя ўмовы пражывання людзей.

Не менш важны праект для паляпшэння жыцця мясцовых жыхароў — у працэсе рэалізацыі.

— Размова пра забеспячэнне якаснай пітной вадой. Праблема хвалявала жыхароў аграгарадка не першы год. Пытанне якасці вады трымалі на кантролі і мясцовыя органы ўлады, і дэпутаты, — звяртае ўвагу **старшыня Старавысокаўскага сельвыканкама Марыя АЛЕСІЧ.**



У Зашыр'і працуе дзве свідравіны. Ачыстка вады ў аграгарадку вядзецца на станцыі абезжалезвання. Але яна была пабудавана яшчэ ў 1970-я гады. Натуральна, што ўзніклі заўвагі па якасці вады. У мінулым годзе было прынята рашэнне правесці мадэрнізацыю і поўную замену сістэмы ачысткі на аб'екце, пабудаваць водапанапорную вежу.

— У дамах функцыянуе цэнтральнае ацяпленне і водазабеспячэнне. Таму пытанне якасці вады ў аграгарадку вельмі важнае і людзі чакаюць яго вырашэння, — падкрэсліла Марыя Алесіч. — Людзі ў нас спагадлівыя, удзячныя за ўвагу да іх населенага пункта. У сваю чаргу на тыя ж ініцыятывы па добраўпарадкаванні тэрыторыі вяскоўцы з радасцю адгукаюцца, прапаноўваюць і свае... Мы, дэпутаты, заўжды падтрымліваем.

## АЛЬТАНКІ — ЗА ПРЭМІЮ

Такім чынам вырашыў распарадзіцца грашовай узнагародай Вішоўскі сельсавет у Бялыніцкім раёне. Прэмію вішоўцы атрымалі за перамогу ў абласным спаборніцтве сярод органаў мясцовага самакіравання. Насельніцтва сельсавета пажадала, каб у месцах чакання аўталавак ім устанавілі альтанкі. Яны хутка з'явяцца ў чатырох населеных пунктах. Пачатак пакладзены, паступова і іншыя пункты прыпынку аўталавак стануць больш камфортнымі.

У Бялыніцкім раёне сем сельсаветаў, дзе ў 180 населеных пунктах пражывае каля 8 тысяч чалавек. Дэпутаты заўсёды гатовы аказаць дапамогу ў вырашэнні надзённых пытанняў.

— Нядаўна звярнулася інвалід II групы з аграгарадка Машчаніца, — расказвае **старшыня Бялыніцкага райсавета Ірына ФУРСАВА.** — Жанчына жыла ў арэндным доме з пячным ацяпленнем, і, як яна паведаміла, ёй вельмі цяжка было самастойна ацяпляць памяшканне. Разам з выканаўчай уладай, грамадскім аб'яднаннем мы знайшлі выйсце са складанай сітуацыі. Падшукалі жыллё ў аграгарадку Вішоў з цэнтральным ацяпленнем, дапамаглі з касметычным рамонтам. Жанчына засталася задаволеная.

Старшыня райсавета расказвае, што напярэдадні Радаўніцы шмат было зваротаў па добраўпарадкаванні могілак. Разам з жыхарамі на работы выходзілі і народныя абраннікі, і камунальнікі. Выдалялі кустоўе, рабілі агароджу, прыбіралі смецце.

— Пытанні паступаюць і на сустрэчах, і падчас прыёмаў грамадзян, і ў прыватным парадку, калі чалавек тэлефануе ў райсавет з просьбай дапамагчы, — кажа суразмоўніца. — Магчыма, некаторыя праблемы не так хутка вырашаюцца, як гэтага хацелася б, але калі пытанне можна знайсці ў рамках заканадаўства, то робіцца ўсё магчымае. Дзейнічаем у цесным узаемадзеянні з выканаўчай уладай.

ЖКГ, дарогі, могілкі — асноўная тэматыка зваротаў. У Год добраўпарадкавання шмат чаго робіцца на апераджэнне, і людзі за гэта ўдзячныя.

— Сёлета асабліва адчуваецца дапамога насельніцтва ў вырашэнні пытанняў навядзення парадку на месцах, — удакладняе Ірына Фурсава. — Добра наладжана гэта работа ў Запольскім, Машчаніцкім сельсаветах. Разам робім зоны адпачынку, добраўпарадкоўваем дзіцячыя пляцоўкі, месцы воінскіх пахаванняў, могілкі. У Заполлі насельніцтва пажадала зрабіць дзіцячую гульнявую і спартыўную пляцоўкі. Людзі сабралі болей чым чатыры тысячы рублёў. Мы звярнуліся па падтрымку ў Магілёўскую абласную асацыяцыю мясцовых Саветаў дэпутатаў і спадзяёмся, што агульнымі намаганнямі ў найбліжэйшы час гэта ініцыятыва будзе рэалізавана.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, Наталля КАПРЫЛЕНКА, Нэлі ЗІГУЛЯ.**

З НАГОДЫ

# «СЦЯГ ПЕРАМОГІ» Ў НАДЗЕЙНЫХ РУКАХ

**Магілёўская моладзь прыняла эстафету ў рэспубліканскай акцыі**

Праект Маладзёжнага савета пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь «Сцяг Перамогі», прысвечаны 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, стартаваў у красавіку і 13 мая прыбыў у Магілёў.



Сцяг Перамогі прывезлі з Оршы прадстаўнікі Маладзёжнага савета. На сустрэчы з магілёўскімі аднагодкамі яны падкрэслілі, што гэта не проста сімвал, гэта памяць аб героях, якія аддалі свае жыцці, каб іх нашчадкі жылі пад мірным небам. Перамяшчэнне сцяга сімвалізуе, як ішло вызваленне 80 гадоў таму.

Моладзь таго горада, куды прыбывае сцяг, робіць якуюнебудзь карысную справу. У Магілёве ўдзельнікі патрыятычнага мерапрыемства пасадзілі аксаміткі на алеі Герояў Савецкага Саюза. На мітынгу на плошчы Славы яны ўшанавалі памяць абаронцаў і вызваліцеляў хвілінай маўчання і ўсклалі кветкі да Вечнага агню.

Урачыстая перадача Сцяга Перамогі адбылася ў школе № 2. Тут жа прайшла тэматычная дыялогавая пляцоўка, дзе моладзь з удзелам прадстаўнікоў мясцовай улады, дэпутатаў абмеркавала ўклад савецкага народа ў Перамогу, а таксама тыя справы, якія сёння робяцца ў мэтах захавання гістарычнай памяці.

Вучань магілёўскай школы № 6 Алег Гурын прызнаўся, што мерапрыемства для яго было вельмі хвалюючае. Ганарова быць датычным да такога сімвалічнага моманту, прасякнуцца патрыятычнай энергетыкай падзеі, адчуць моц адзінства.

— Гэты сцяг — даніна павагі тым, хто заваяваў для нас Перамогу, — падзяліўся эмоцыямі юнак. — Мы, нашчадкі герояў, якія набліжалі Перамогу, павінны памятаць, якой цаной заваявана наша мірнае жыццё.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**



# ЗА ЛІЧБАМІ — РЭАЛЬНАЯ ПРАЦА

## Якія пытанні хвалююць жыхароў цэнтральнага рэгіёна і што было ў цэнтры ўвагі на чарговай сесіі Мінаблсавета?

На мінулым тыдні графік работы члена Савета Рэспублікі, старшыні Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталлі ЯКУБІЦКАЙ быў асабліва насычаным. Напярэдадні 9 Мая парламентарый правяла прыём грамадзян у Мінску, а таксама пасяджэнне чарговай сесіі Мінскага аблсавета. «Звязда» далучылася да дэпутацкіх мерапрыемстваў і высветліла падрабязнасці.



### «ПРАСОЧЫМ, КАБ УСЕ ВЕДАЛІ ДА ВАС ДАРОГУ»

Слухаць людзей, быць на пастаяннай сувязі з выбаршчыкамі, садзейнічаць у вырашэнні іх праблемных пытанняў — важная задача, якая стаіць перад дэпутатамі ўсіх узроўняў. Народныя выбраннікі на пастаяннай аснове праводзяць асабістыя прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі, сустрэчы з людзьмі ў працоўных калектывах і ўстановах адукацыі — усё для таго, каб зрабіць жыццё людзей лепшым.

На прыёме грамадзян, які правяла Наталля Віктараўна 8 мая, было шматлюдна. Адзін з заяўнікаў, жыхар вёскі Бяларучы Лагойскага раёна, выказаў занепакоенасць з нагоды недастатковага абазначэння населенага пункта на дарожных знаках. Паводле яго слоў, гэта прыводзіць да цяжкасцяў пры дастаўцы неабходных тавараў і паслуг у вёску. «Дарожны знак мы вам абавязкова ўстановім і прасочым за тым, каб усе службы ведалі да вас дарогу», — адказала сенатар заяўніку.

Жыхар вёскі Стары Будкаў Бярэзінскага раёна прасіць уладзіць зямельную спрэчку і перадаць яму ў карыстанне землі сельскагаспадарчага прызначэння. Як патлумачыла старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Якубіцкая, перадача такіх зямель — у выключнай кампетэнцыі кіраўніка дзяржавы. «Але мы абавязкова падбяром вам участак у межах населенага пункта для асабістага карыстання», — паабяцала парламентарый.

### АДЗІН З ПРЫЯРЫТЭТАЎ — СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

Фарміраванне бюджэту — гэта не проста звод лічбаў, а вынік рэальнай, штодзённай работы прадпрыемстваў, спецыялістаў і ўсяго рэгіёна. Гэта абмяркавалі на сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў, падводзячы прамежкавыя вынікі развіцця рэгіёна і раскрываючы структуру бюджэту на 2025 год.

«Мы з вамі разумеем, што за кожнай лічбай стаіць паспяховая работа нашых прадпрыемстваў, нашых людзей. Менавіта гэта дазваляе нам сёння фарміраваць бюджэт і накіроўваць сродкі на ключавыя напрамкі», — адзначыла старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Якубіцкая.

Адным з прыярытэтаў застаецца падтрымка сельскай гаспадаркі. За апошні год істотна абнавілася матэрыяльна-тэхнічная база аграрнага сектара. «Літаральна толькі летась мы закупілі каля 100 энерганасычаных трактароў і 60 збожжаўборачных камбайнаў. Для нашай вобласці гэта сур'ёзная сістэмная работа, якая наўпрост уплывае на валавую вытворчасць і прадукцыйнасць», — падкрэсліла Наталля Якубіцкая.

Значныя намаганні былі накіраваны на развіццё сацыяльнай інфраструктуры, уключаючы адукацыю. Як паведаміла сенатар, за чатыры гады ў Мінскай вобласці пабудавалі 31 аб'ект устаноў дашкольнай і школьнай адукацыі: «Такім чынам мы вырашалі праблему забяспечанасці дзяцей месцамі ў дзіцячых садках, што для нас вельмі важна».

Што датычыцца фарміравання бюджэту, то глабальных змяненняў у 2025 годзе не адбылося. Асноўныя параметры засталіся ранейшымі: «Падатак на прыбытак акумулюецца на абласным узроўні і складае 44,7 % у структуры даходаў. Падаходны падатак з фізічных асоб застаецца ў раёне 23,9 %, падатак на дададзеную вартасць — 21 %. Акрамя таго, маёмасныя падаткі, у прыватнасці падатак на нерухомасць, размяркоўваюцца на ўзроўні 50 % паміж раёнамі і вобласцю», — сказала Наталля Якубіцкая.

### БОЛЬШ ЗА 400 ПУСТЫХ ДАМОЎ УЦЯГНУТЫ Ў ГАСПАДАРЧЫ АБАРОТ

Работа па навядзенні парадку і ўключэнні аб'ектаў, што не выкарыстоўваюцца, у гаспадарчы абарот працягваецца сістэмна і знаходзіцца пад асаблівым кантролем мясцовай улады. У рамках падрыхтоўкі да сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў былі агучаны актуальныя вынікі і дадзеныя ацэнкі эфектыўнасці работы на месцах.

«Гэта даручэнне знаходзіцца на кантролі крымінальнага і судовага ведамстваў, і мы падыходзім да яго выканання з усёй адказнасцю», — падкрэсліла старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Якубіцкая.

«За першы квартал 2025 года раёнамі вобласці ўцягнута ў гаспадарчы абарот 400 дамоў. Мы таксама вярнулі ў сельскагаспадарчы абарот 102 гектары зямлі пры заданні ў 76 гектараў», — адзначыла парламентарый.

Лічбы гавораць самі за сябе: цэнтральны рэгіён робіць важкі ўклад у выкананне агульнарэспубліканскіх задач. «На ўзроўні краіны на сёння ў абарот уцягнута 1063 дамы пры заданні 1631. З іх 505 — па Мінскай вобласці. Гэта значыць, амаль трэць усіх уцягнутых аб'ектаў прыпадае на наш рэгіён», — падсумавала Наталля Якубіцкая.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота тэлеграм-канала «Мінская вобласць I Пра галоўнае».**



ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор электронного аукциона, оператор ЭТП** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н Сайты в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ЗАО «Банк «РЕШЕНИЕ», УНП 100789114, ул. Игнатенко, д. 11, г. Минск, 220035, тел. +375 17 369 73 88 |

***Ранее опубликованное извещение о проведении электронного аукциона опубликовано 03.10.2024 в газете «Звязда»***

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| № | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, в бел. руб. |
|---|---|---|
| **1** | Изолированное помещение (торговое помещение) № 9, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Строителей, 28-9, общая площадь: 661, 7 кв. м, инв.№ 610/D-73411 | 708 764,00 |
| **2** | Изолированное помещение (торговое помещение) № 12, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Строителей, 28-12, общая площадь: 510,9 кв. м, инв.№ 610/D-73412 | 570 028,00 |
| **3** | Помещение транспортного назначения средний ярус (машино-место) (№№ 63, 84), расположенное по адресу: г. Минск, ул. М. Богдановича, 126-2, доля 2/44 в общ. пл. 1 517,40 кв. м | 25 500,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронного аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP 30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % (процентов) от начальной цены лота

**Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by**

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) дней** после проведения электронного аукциона

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 5 (пять) дней** со дня заключения договора купли-продажи

**Электронный ауцион проводится в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресу:** https://iintorgi.by

Победитель электронного аукциона, либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 % (претендент на покупку), обязан возместить организатору электронного аукциона затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 0,5 % от цены продажи лота, в случае, если конечная цена продажи предмета аукциона от 500 тыс. бел. руб., 1 % от цены продажи лота, в случае, если конечная цена продажи предмета электронного аукциона до 500 тыс. бел. руб., но не менее 200,00 бел. руб.

Организатор электронного аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения электронного аукциона

**Дата и время проведения электронного аукциона:**
30.05.2025,
начало электронного аукциона: 10.00,
окончание электронного аукциона: 16.00,
электронный аукцион продлевается на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания электронного аукциона.
Электронный аукцион проводится
на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронном аукционе принимаются по 29.05.2025 г. до 17.00** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего
**УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги»**
на праве хозяйственного ведения (Продавец).

**Аукцион состоится 30.05.2025 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

**Лот № 1:**
37/158 долей в праве собственности на многоквартирный жилой дом с инв. № 420/С-3110.
Адрес: Гродненская обл., Лидский р-н, Дубровенский с/с, д. Кирьяновцы, 57.
**Начальная цена без НДС** – 1 956,42 руб.

**Лот № 2:**
1/2 доли в праве на многоквартирный жилой дом с инв. № 421/С-4272.
Адрес: Гродненская обл., Вороновский р-н, Бастунский с/с, д. Бастуны, ул. Советская, 32.
**Начальная цена без НДС** – 3 553,33 руб.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, au.nca.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

# «НІЯКІЯ СУЧАСНЫЯ СРОДКІ КАМУНІКАЦЫЙ НЕ ЗАМЕНЯЦЬ ЖЫВЫХ ЗНОСІН»

## У гэтым перакананы дэпутат па Чкалаўскай выбарчай акрузе № 97 Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ

Невыпадкова тыдзень, які намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў праводзіць у сваёй акрузе, распісаны пагадзінна. Парламентарый адгукаецца на просьбы аб сустрэчы ў любых калектывах, імкнецца пагутарыць з прадстаўнікамі ўсіх прадпрыемстваў, якія размешчаны на тэрыторыі акругі, незалежна ад іх формы ўласнасці. Будучы ў статусе дэпутата Вячаслаў Даніловіч правёў ужо каля 80 такіх сустрэч.





### «РАЗМОВА З МОЛАДДЗЮ — ВЕЛЬМІ ІСТОТНЫ МОМАНТ»

«Літаральна ўчора адбылася размова са старшакласнікамі сярэдняй школы № 11 г. Мінска, прысвечаная праблематыцы Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, — канкрэтызаваў парламентарый. — Абмяркоўвалі ўклад савецкіх людзей у дасягненне Перамогі, згадалі ахвяры, якія панёс беларускі народ. Хлопцы і дзяўчаты задавалі пытанні, якія іх цікавяць. Размова з моладдзю — вельмі істотны момант, бо мала захоўваць памяць аб гераізме і трагедыі савецкага народа ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, трэба трансліраваць яе будучым пакаленням».

Дэпутата радуе, што падчас сустрэч у калектывах усё часцей гучыць пытанне захавання гістарычнай памяці. «Мы бачым на прыкладзе нашай паўднёвай суседкі, што бывае з народам, які гістарычную памяць не захоўвае, — звярнуў увагу Вячаслаў Даніловіч. — Людзі гэта таксама разумеюць».

Па словах дэпутата, відавочна разуменне людзьмі і тых станоўчых змен, якія адбыліся ў нашай краіне. «Часам мы не заўважаем тое, што маем: нам падаецца, што гэта заўсёды было, — адзначыў ён. — Звяртаю ўвагу людзей на тое, што, нягледзячы на адсутнасць вялікай колькасці карысных выкапняў, іншых багаццяў, дзяржава паступова робіць крокі па паляпшэнні і сацыяльнай інфраструктуры, і эканомікі. Але шмат што залежыць непасрэдна ад іх, працаўнікоў. Іншага багацця ў дзяржавы — акрамя людзей — фактычна няма. Прыемна, што выбаршчыкі гэта ўсведамляюць».

Ідэалогія беларускай дзяржавы — адна з ключавых тэм размоў з калектывамі, што асабліва актуальна ў сувязі з падпісаннем кіраўніком краіны Дырэктывы № 12. «Калі дзяржава не мае ідэалогіі, яна не мае будучыні, — падкрэсліў дэпутат. — Ідэалогія беларускай дзяржавы грунтуецца на зразумелых любому чалавеку рэчах: патрыятызме, адзінстве і справядлівасці. Калі размаўляеш з грамадзянамі гэтымі катэгорыямі, у іх не ўзнікае ніякіх пытанняў».

### АД ПРАБЛЕМ ЦЭЛАГА МІКРАРАЁНА ДА МІЖАСОБАСНЫХ СПРЭЧАК

Жыхары Чкалаўскай выбарчай акругі, якая знаходзіцца ў сталіцы, шмат увагі аддаюць добраўпарадкаванню. Па словах дэпутата, гэта адна з топавых тэм, што хвалюе людзей падчас асабістых прыёмаў. «Заўсёды імкнуся даводзіць жыхарам: шмат у чым гэты парадак залежыць ад кожнага з нас, — акцэнтаваў увагу Вячаслаў Даніловіч. — Не трэба чакаць, што дзяржава прыйшле кагосьці, каб навесці парадак. Трэба самім уключацца ў гэты працэс». Так і адбываецца, аб чым сведчаць рэгулярныя суботнікі на тэрыторыі акругі.

З красавіка мінулага года дэпутатам праведзена звыш 40 асабістых прыёмаў грамадзян. Улічваючы спецыфіку выбарчай акругі, прыёмы праводзяцца не толькі на базе Адміністрацыі Кастрычніцкага раёна, а і ў мікрараёнах Сокал і «Мінск-Свет». Усё з адной мэтай — быць бліжэй да людзей.

Дэпутат удзячны кіраўніцтву Кастрычніцкага раёна за наладжаную супольную работу па вырашэнні тых пытанняў, з якімі да яго звяртаюцца людзі. Дзякуючы такому ўзаемадзеянню, у мікрараёне Сокал працуе амбулаторыя для мясцовых жыхароў, дзе праводзяць прыёмы ўрачы сталічнай паліклінікі № 3. Па просьбе людзей скарэкціраваны графік пэўных спецыялістаў, каб жыхары маглі вырашыць свае пытанне на месцы. Акрамя таго, у лесапаркавай зоне мікрараёна створана спартыўная пляцоўка, што таксама адпавядае запытам людзей. Вырашана пытанне і забяспечанасці жыллём настаўнікаў сярэдняй школы № 194, якая размешчана ў Сокале.

«Да нядаўняга часу ў гэтай навучальнай установе была вялікая цякучка: маладыя спецыялісты адпрацоўвалі па размеркаванні і сыходзілі ў іншыя навучальныя ўстановы з той прычыны, што ім было нязручна дабірацца да мікрараёна, — агучыў праблему дэпутат. — Сумесна з мясцовымі ўладамі знайшлі добрае выйсце: усе настаўнікі школы, у каго была патрэба ў жыллі, атрымалі арэндныя кватэры. Гэты важны момант паспрыяў замацаванню педагогаў на месцы работы».

Даводзіцца народнаму выбранніку вырашаць і міжасобасныя спрэчкі. «Імкнуся даводзіць да людзей, што наша свабода заканчваецца там, дзе пачынаецца свабода іншага чалавека, — адзначыў ён. — Усе мы жывём у грамадстве, і таму вельмі важна пры ўзнікненні розных праблем прыходзіць да паразумення, а не заганяць сітуацыю ў тупік. Важна наладжваць камунікацыі паміж людзьмі. Не трэба чакаць ад дзяржавы вырашэння ўсіх праблем. Праблемы ў большай ступені заключаюцца ў нас з вамі».

Графік работы дэпутата ў акрузе фарміруецца не толькі зыходзячы з запытаў і прапаноў грамадзян, працоўных калектываў, а таксама з яго асабістай ініцыятывы. «Кіраўніцтвам Палаты прадстаўнікоў рэгулярна ставіцца задача прапрацаваць тое ці іншае пытанне ў калектывах, пачуць меркаванні людзей на месцах, — удакладніў Вячаслаў Даніловіч. — У прыватнасці, плануецца карэкціроўка заканадаўства, звязаная з удасканаленнем прадпрымальніцкай дзейнасці. Перад дэпутацкім корпусам стаіць задача: непасрэдна ў прадстаўнікоў бізнес-супольнасці даведацца, што яшчэ варта зрабіць, каб палепшыць умовы для вядзення бізнесу, каб ён пры гэтым заставаўся сацыяльна адказным. Кожны законапраект закранае інтарэсы розных пластоў насельніцтва, прадпрыемстваў, арганізацый, і задача дэпутата — урэгуляваць спрэчныя пытанні, знайсці кампраміс, каб закон, які будзе прыняты, дзейнічаў эфектыўна».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота з архіва дэпутата.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні ГІГІНУ Вадзіму Францавічу, дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, генеральнаму дырэктару Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю маці.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Вадзіму Францавічу ГІГІНУ ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю маці.**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении электронного аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому филиалу РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**Аукцион состоится 13.06.2025 г. в 11.00 по адресу: https://gostorg.by. Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | **Лот № 1: легковой автомобиль KIA Sportage,** г. в. 2012, гос. № 1114 IX-4, vin U5YPC811ADL267034 – тип топлива бензин, объем 2,0 л; пробег на 12.05.2025 г. составляет 268100 км; - автомобильные шины 225/65R17 BEL-411 (летняя) (4 шт.) - автомобильные шины 225/60R17 99HBEL-354 (летняя) (4 шт.) |
| **Условия проведения аукциона** | 1. Победитель электронных торгов либо единственный участник, согласный приобрести Лот по начальной цене, увеличенной на пять процентов (далее – Претендент на покупку), обязан заключить с Продавцом договор купли-продажи в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов после предъявления Продавцу платежного документа, подтверждающего оплату стоимости лота, а также возмещение стоимости затрат на организацию и проведение электронных торгов. 2. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) обязан перечислить на расчетный счет Продавца денежные средства в счет возмещения стоимости затрат на организацию и проведение электронных торгов в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона. 3. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) обязан заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. 4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством и настоящим договором для Победителя электронных торгов. |

| | |
|---|---|
| **Начальная цена продажи** | **Лот № 1:** 7 556,03 руб. (семь тысяч пятьсот пятьдесят шесть рублей три копейки), в том числе: - легковой автомобиль KIA Sportage стоимостью 7 169,04 руб. без учета НДС; - автомобильные шины 225/65R17 BEL-411 (летняя) (4 шт.) стоимостью 231,86 руб. с учетом НДС; - автомобильные шины 225/60R17 99HBEL-354 (летняя) (4 шт.) стоимостью 155,13 р. с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | **Лот № 1:** 755 руб. (семьсот пятьдесят пять рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Шаг электронных торгов** | 5 % |
| **Адрес и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются на сайте ЭТП https://gostorg.by. Последний день приема заявлений – 11.06.2025 г. до 15.00 |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://gostorg.by | |

# ВЫРАТАВАНАЯ ПАМЯЦЬ

## Па ініцыятыве пенсіянеркі на мясцовых могілках з'явіўся помнік землякам, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Еўропы

Для Валянціны Бурак, старасты вёскі Шэйпічы Асіповіцкага раёна, тэма вайны асаблівая. Усе сем сыноў яе бабулі Евы пайшлі на фронт — ні адзін не вярнуўся. Чацвёра з іх загінулі на тэрыторыі Еўропы, там, дзе цяпер зносяць помнікі вызваліцелям. Жанчына вырашыла аднавіць справядлівасць і натхніла на гэта аднавяскоўцаў.



Павел загінуў 9 мая 1945 года ў Берліне. Сцяпана і Пецю пахавалі на полі бітвы ў Польшчы, а Мікола, які таксама дайшоў да Польшчы, не вярнуўся з разведкі. Косця, Аркадзь і Іван — загінулі ў Беларусі.

— Калі пачалі зносіць помнікі чырвонаармейцам у Польшчы і Германіі, начамі не магла спаць, — расказвае Валянціна Бурак. — Звярнулася да людзей, і яны падтрымалі.

Помнік у выглядзе каплічкі з крыжам наверсе, эскіз якога жанчына намалявала, усім спадабаўся. Выраблялі талакой. Істотна дапамаглі Васіль і Наталля Кірылавы, Анатоль Дзмітрыенка, Вольга Селядцова, сын Валянціны Міхайлаўны — Яўген Бурак, Аляксандр Кустаў.

Прозвішчы для помніка Валянціна Бурак выпісала з кнігі «Памяць» і кожнае праверыла. Усяго ў спіс трапілі 44 чалавекі — усе, хто загінуў у Еўропе. Валянціна Міхайлаўна сваіх дзядзькаў, якія склалі галовы ў Беларусі, тут ды не ўпісвала.

Могілкі ў Шэйпічах старадаўнія. Ды і сама вёска з гісторыяй. Сёлета будзе адзначаць 465-годдзе.

— І сёння жыве традыцыя кожную вясну могілкі прыбіраць— расказвае староста. — Збіраемся штогод па 20–30 чалавек. Памяць ад бацькоў дзецям перадаецца.

У сярэдзіне 1970-х Валянціне маці расказала пра магілу партызана, якога разам з аднавяскоўцамі хавала. Маці паведаміла Валянціне, што звалі партызана Пётр Дашукевіч і што ён маладым загінуў падчас бою.

— Калі крыж згніў, я папрасіла родных і суседзяў дапамагчы магілу аднавіць, — расказвае староста. — Прыцягнулі бардзюры, камяні, паднялі яе. Зяць Уладзімір Рубінчык зладзіў металічную тумбу з зоркай. Пафарбавалі, прымацавалі таблічку. Памяць пра партызана жыве.

Валянціна Бурак перакананая, што дарослыя павінны часцей расказваць дзецям пра вайну і продкаў. Тады памяць ніхто не перакрэсліць.

Клапоціцца Валянціна Бурак і пра жывых. Нездарма яе старастам выбралі. Вёска маленькая — 45 чалавек, але ўсюды павінен быць парадак. У старасты на ганаровым месцы ляжыць вялікая папка, дзе захоўваюцца справаздачы па тых праблемах, якія яна з мясцовымі ўладамі і жыхарамі вырашала.

У пасёлку Ялізава, напрыклад, з'явіліся зручныя пераходы праз чыгунку, а ад самога пасёлка і праз усю вёску Шэйпічы — дарога.



— Усё пачалося з артыкула ў газеце, што да Шэйпіч пабудавана дарога, — усміхаецца жанчына і дэманструе перапіску з афіцыйнымі ўстановамі. — Насамрэч, да царквы праклалі 500 метраў, а напісалі, што дарогу да Шэйпіч пабудавалі. Я патэлефанавала ў рэдакцыю і запрасіла праехацца па гэтай дарозе. Пасля чаго зрабілі нам дарогу.

Асаблівасць Валянціны Міхайлаўны ў тым, што яна не папракае і не патрабуе, а ветліва просіць. Наконт дарогі ў райвыканкам не зварот напісала, а сапраўдны літаратурны твор пад назвай «Жыві, мая вёсачка!». Можа таму праблема была паспяхова вырашана?

Аднойчы жыхарка папрасіла старасту дапамагчы з электрыкамі, маўляў, святло ў доме міргае. І тая напісала ў электрасеткі гістарычную даведку. «Нашай вёсачцы 465 гадоў. На сваім веку яна спазнала ўсё: і голад, і холад, і разруху, і аднаўленне... У 1966 годзе ў вёсцы з'явілася першая лямпачка. І не міргала — трансфарматар вытрымліваў нагрузку. Але з тых часоў многае змянілася. Падключаем да разетак шмат чаго. Зрабіце нам добры трансфарматар, каб вытрымліваў нагрузку». Зрабілі!

— Некаторыя лічаць, што марную сілы, — кажа жанчына. — А мне гэта, наадварот, здароўе прыбаўляе. Прыемна, што магу карыснае людзям зрабіць. Пасля абавязкова дзякую выканаўцам.

— Наша Міхайлаўна ўжо і за іншую вёску ўзялася, — уступае ў размову старшыня Свіслацкага сельсавета Аляксей Траццякоў, які вельмі паважае Валянціну Бурак за яе актыўнасць і неабыякавасць. — Ёй ужо свіслацкія бабулькі тэлефануюць са сваімі праблемамі. Яна і за іх турбуецца.

Наогул жанчына — асоба ў раёне вядомая. Калі працавала ў Ялізаве, спявала ў ансамблі «Вечарынка». З канцэртамі ездзілі і ў іншыя вобласці. Сёлета Валянціна Міхайлаўна на Дзень Незалежнасці, 3 ліпеня, адзначыць 75-годдзе. У ансамблі яна ўжо не спявае, але сяброўкі заўсёды гатова падтрымаць. Два вялікія сшыткі песень і прыпевак напісала. Апошнім часам часцей да жыццёвых тэм звяртаецца. Склала верш пра тое, што найлепшае лячэнне — не таблеткі, а прыпеўкі. Прысвячэнне старшыні сельсавета ёсць. Пра тое, які ён клапатлівы. Голас у жанчыны сакавіты — прыгожа спявае.

— З дзяцінства з песняй не развітваюся, — усміхаецца яна. — Калі ў маці схваткі пачаліся, родныя пабеглі акушэрку зваць. А калі вярнуліся, я ўжо ляжала на сталe і «спявала».

Нягледзячы на хворыя ногі, Валянціна Бурак не ўпускае магчымасці паказаць мне яшчэ і хату бабулі, што па суседстве. Там яна нарадзілася. Кажа: у бабулі Евы вайна адняла сыноў, але не нявестак. Яны з дзецьмі ўсё жыццё з ёй заставаліся. Жылі дружна, адной сям'ёй. І гэта давала сілы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

*Асіповіцкі раён.*


12.05.2025 № б/н

Владельцам третьего выпуска облигаций

## Об изменении сведений о способе обеспечения исполнения обязательств

Общество с ограниченной ответственностью «Темпл Сити» информирует, что решением Общего собрания участников ООО «Темпл Сити» внесены следующие изменения в п 2.8.1. Проспекта эмиссии облигаций третьего выпуска (далее – проспект эмиссии):

«2.8.1. Эмитент осуществляет эмиссию Облигаций в соответствии с подпунктом 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 г. № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг» (далее – Указ № 277).

Исполнение обязательств Эмитента по Облигациям обеспечено залогом недвижимого имущества, находящегося в собственности Эмитента, зарегистрированного в Едином государственном регистре недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним, оценочной (рыночной) стоимостью 594 153,90 евро.

Предметом залога выступает следующее недвижимое имущество, указанное в таблице 1.

*Таблица 1*

| № п. п. | Наименование объекта оценки недвижимого имущества, инвентарный номер, место нахождения, общая площадь, назначение, наименование | Рыночная стоимость, евро |
|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-7102117, расположенное по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Независимости, 117А-4т, площадь 343,5 кв. м, назначение – Торговое помещение, наименование – Торговое помещение | 310 322,42 |
| 2 | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-7102116, расположенное по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Независимости, 117А-3т, площадь 314,2 кв. м, назначение – Торговое помещение, наименование – Торговое помещение | 283 831,48 |
| | ИТОГО: | 594 153,90 |

Независимая оценка недвижимого имущества проведена исполнителем оценки – ООО «ФБК-Оценка» (место нахождения: Республика Беларусь, 231125, Гродненская область, Ошмянский район, с/с Новоселковский, аг. Новоселки, ул. Центральная, д. 62-5, пом. 5-28; почтовый адрес: Республика Беларусь, 220090, г. Минск, тракт Логойский, 22А, корп. 2, 13 этаж. УНП 591706961). Дата проведения оценки – 10 декабря 2024 г. Заключение о независимой оценке от 10 декабря 2024 г. № 173-12/24.

Экспертиза достоверности независимой оценки проведена Унитарным предприятием по оказанию услуг «Минское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты» (место нахождения: Республика Беларусь, 220113, г. Минск, ул. Я. Коласа, д. 65, ком. 3, УНП 100144204).

По результатам экспертизы документы оценки соответствуют требованиям нормативных правовых актов об оценке стоимости объектов гражданских прав, результат независимой оценки является обоснованным (заключение экспертизы достоверности независимой оценки от 12 декабря 2024 г. № 4/2752-2.0-4/863).

Недвижимое имущество, предоставляемое в качестве обеспечения исполнения обязательств по Облигациям, никому ранее не отчуждено, не обременено иными правами (притязаниями) третьих лиц, в споре и под запретом (арестом) не состоит и не подлежит удержанию. Иные обременения, за исключением договоров аренды, отсутствуют.

Исполнение обязательств Эмитента по Облигациям обеспечивается в течение всего срока обращения Облигаций, а также после окончания срока обращения облигаций до исполнения обязательств Эмитента по Облигациям в полном объеме.

Последующий залог предмета залога допускается при условии, что общий (суммарный) объем обязательств, обеспечиваемых залогом предмета залога, не превысит 80 процентов стоимости предмета залога.

В случае неисполнения или ненадлежащего исполнения Эмитентом обязательств по Облигациям, а также в случае принятия решения о ликвидации Эмитента, реализация недвижимого имущества, выступающего в качестве предмета залога, осуществляется в порядке, установленном Гражданским кодексом Республики Беларусь, иными актами законодательства.».

*Директор* *А.Л. Солонович*

УНП192280260



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, находящегося в собственности Минской области и принадлежащего
**Государственному предприятию «УКС Вилейского района»** (Продавец)
на праве хозяйственного ведения.

**Аукцион состоится 29.05.2025 в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

**Лот № 1:**

**легковой седан CHEVROLET LACETTI,**
кузов (рама) KL1NF19BJ8K913152.

Начальная цена с НДС 20 % – 5 166,72 руб.

**Место нахождения:**
Минская область, г. Вилейка, ул. 1 Мая, 89.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by, на электронной торговой площадке Организатора аукциона gostorg.by.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182



Мясцовае Самакіраванне. Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 10 951. Нумар падпісаны ў 19.30 13 мая 2024 года.**

# КРЫВАВАЯ ЗАСЛОНА

## Чаму ўлады Польшчы і Прыбалтыкі ператвараюць граніцы ў мінныя палі?



У 1997 годзе была прынята Канвенцыя аб забароне прымянення, накаплення запасаў, вытворчасці і перадачы супрацьпяхотных мін і аб іх знішчэнні (Атаўская канвенцыя). Яна ўступіла ў дзеянне 1 сакавіка 1999-га. Удзельнікамі глабальнага дагавора з'яўляюцца 164 краіны. Паводле ацэнак Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа, гэты від узбраенняў прыводзіць да вялікай колькасці ахвяр сярод мірнага насельніцтва і працягвае ўяўляць небяспеку яшчэ доўгія гады пасля завяршэння ваенных дзеянняў. Па звестках Landmine Monitor 2024 (штогадовая справаздача, якая рыхтуецца экспертамі Міжнароднага руху за забарону супрацьпяхотных мін ICBL і Кааліцыі па касетных боепрыпасах CMC), у 2023 годзе сама меней 5757 чалавек былі паранены і забіты мінамі, якія засталіся пасля войнаў. Больш за ўсё ахвяр — 1003 — было зарэгістравана ў М'янме. 84 % пацярпелых прыпадае на грамадзянскае насельніцтва, з іх больш за трэць складаюць дзеці. Як паведаміў генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш, усяго ў свеце цяпер 100 мільёнаў чалавек жывуць пад пагрозай выбуху. «Супрацьпяхотныя міны ўяўляюць сабой рэальную небяспеку для грамадзянскага насельніцтва. Нават пасля спынення баявых дзеянняў гэтая жахлівая і невыбіральная зброя можа трымаць у страху пакаленні людзей», — адзначыў Гутэрыш. Ён заклікаў краіны далучацца да Атаўскай канвенцыі, каб разам «стварыць бяспечную будучыню».

### АДАБРЭННЕ З ПАСКАРЭННЕМ

Беларусь з'яўляецца ўдзельніцай канвенцыі з 1 сакавіка 2004 года. У мэтах выканання сваіх абавязацельстваў па гэтым дакуменце наша краіна поўнасцю знішчыла запасы мін, якія засталіся ад Савецкага Саюза (больш чым 3,5 млн мін тыпу ПФМ-1 і каля 300 тыс. супрацьпяхотных мін трацілавага напаўнення). Поўнае выкананне Беларуссю абавязацельстваў па Атаўскай канвенцыі было забяспечана да красавіка 2017-га.

Аднак улады шэрагу еўрапейскіх дзяржаў скіраваны зусім не на мір. 18 сакавіка кіраўнікі Мінабароны Польшчы, Літвы, Латвіі і Эстоніі зрабілі сумесную заяву аб тым, што яны рэкамендавалі сваім урадам выйсці з Атаўскай канвенцыі аб забароне супрацьпяхотных мін. Пазней да іх далучылася і Фінляндыя. Літаральна на наступны дзень, 19 сакавіка, Мінабароны Польшчы паведаміла аб планах задзейнічаць супрацьпяхотныя міны ў якасці элемента абаронча ўмацаванняў «Усходні шчыт» на граніцах з Беларуссю і Расіяй. Пра такі ж крок пасля заявіла і абароннае ведамства Літвы.

Адабрэнне на «крывавую заслону» прыбалтыйскія ўлады арганізавалі з паскарэннем. 24 красавіка прэзідэнт Латвіі Эдгар Рынкевіч зацвердзіў закон аб выхадзе з Атаўскай канвенцыі. У гэты ж дзень ідэнтычны законапраект ухваліў урад Эстоніі. Напярэдадні рашэнне аб выхадзе з канвенцыі было аднагалосна падтрымана літоўскім сеймам. Прэзідэнт Латвіі заявіў, што засакрэціць планы па размяшчэнні супрацьпяхотных мін на граніцы. На пытанне журналістаў аб магчымых ахвярах сярод людзей і дзікіх жывёл Эдгар Рынкевіч цынічна заўважыў, што «пытанні нацыянальнай бяспекі застаюцца прыярытэтам».

### КУРС НА КАНФРАНТАЦЫЮ

Як адзначыла афіцыйны прадстаўнік МЗС Расіі Марыя Захарава, замест мер па зніжэнні напружанасці Літва, Латвія, Эстонія і Польшча працягваюць курс на канфрантацыю, спрыяюць эскалацыі напружанасці на еўрапейскім кантыненце. Аб гэтым паведаміла газета «Известия». «Усё гэта зроблена, зразумела, у інтарэсах НАТА», — падкрэсліла Марыя Захарава. Яна адзначыла, што нядаўняя сумесная заява балтыйскіх краін і Польшчы аб выхадзе з канвенцыі накіравана на развіццё ўзаемадзеяння з вытворцамі супрацьпяхотных мін з ЗША. Паводле слоў дыпламата, планецца выкарыстанне снарадаў для стварэння мінных палёў на ўсходнім флангу НАТА і для паставак ва Украіну.

У Расіі заявілі, што рашэнне краін Балтыі і Польшчы «непазбежна прывядзе да далейшай эскалацыі напружанасці ў Еўропе і дэградацыі сітуацыі ў галіне рэгіянальнай і міжнароднай бяспекі», і паабяцалі крокі ў адказ. «Краіны Захаду гатовы адмовіцца ад міжнародна-прававых абавязацельстваў літаральна ў любую секунду, тады, калі ім уздумаецца, калі ім гэта выгадна і спатрэбіцца. Яны абсалютна не турбуюць сябе пошукам важкіх і адэкватных аргументаў для абгрунтавання такіх дзеянняў. Зрабілі заяву і «выйшлі», — заўважыла Марыя Захарава.

### БЫЦЬ НАПАГАТОВЕ

Міністр замежных спраў Беларусі Максім Рыжанкоў заўважыў, што «яшчэ 20 гадоў таму, калі гэтыя дзяржавы далучаліся да Атаўскай канвенцыі (інтэрнэт памятае ўсё), колькі было заяў з боку палітыкаў гэтых дзяржаў, што яны павінны прытрымлівацца найвышэйшых стандартаў гуманістычнага свету, поўнасцю садзейнічаць спыненню ўзбраення супрацьпяхотнымі мінамі, раззбройвацца самім, дапамагаць іншым, што гэта нейкі найвышэйшы стандарт гуманнасці ў свеце». «Нават Літва па лініі адпаведных праграм разам з Канадай дапамагала Беларусі знішчаць нашы запасы мін. А польскія палітыкі казалі, што, калі мы не далучымся да канвенцыі, на нас будзе вельмі дрэнна глядзець увесь свет», — адзначыў міністр.

Максім Рыжанкоў звярнуў увагу, што цяпер самі гэтыя краіны ўстанаўліваюць міны, і перасцярог ад наступстваў: «Калі міна дзесьці стаіць, то чакайце ахвяр сярод ці дзікіх жывёл, ці мігрантаў, ці бежанцаў, ці нават мясцовага насельніцтва. Вось такая «гуманістычная» сутнасць гэтых урадаў сёння».

Міністр заявіў, што Беларусі ў гэтых умовах трэба быць напагатове, але не ісці на мілітарызаваныя падыходы па прыкладзе гэтых жа краін. «Мы ў гэтай гонцы ўзбраенняў не атрымаем поспеху. Але некаторыя формы супрацоўніцтва з нашымі найбліжэйшымі партнёрамі, саюзнікамі — з Расіяй — па ядзерным стрымліванні, стрымліванні балістычнай зброяй мы робім, — падкрэсліў кіраўнік МЗС. — Гэта значна танней і больш эфектыўна».

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

### Даслоўна

### «Варта ўспомніць урокі Вялікай Айчыннай вайны»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 9 Мая, падчас выступлення на ваенным парадзе ў Мінску, прысвечаным 80-й гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, заклікаў палітыкаў і народы заходніх краін прыгадаць яе гістарычныя ўрокі.**

Прэзідэнт адзначыў, што Еўрасаюз, які ствараўся як палітычнае і эканамічнае аб'яднанне, фактычна трансфармаваўся ў таталітарны ваенна-палітычны блок адкрыта рэваншысцкіх настрояў. Брусель планамерна ператварае тэрыторыі Польшчы і прыбалтыйскіх краін у зыходныя раёны для атакі на ўсходніх рубяжах Паўночнаатлантычнага блока. У год 80-годдзя Вялікай Перамогі Еўрасаюз мае намер узняць аб'ёмы ваенных асігнаванняў да ўзроўню вышэй за 3 % ад ВУП. Варшава і Вільнюс маюць намер паставіць на граніцы з Беларуссю і Расіяй мінна-выбухныя загароды.

***«Таму сёння перад аблiччам жахлівай пагрозы еўрапейскага фашызму, які адраджаецца, мы заклікаем успомніць урокі Вялікай Айчыннай вайны. Вось для чаго нам патрэбна сёння гэтая Перамога і ўшанаванне тых герояў. Мы заклікаем усіх: і палітыкаў, і лідараў, і народы заходніх краін», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.***

Але не варта памылкова разумець мірную рыторыку Беларусі. «Так, мы заклікаем да міру. Так, мы ўсім сэрцам жадаем спыніць усе войны і канфлікты на планеце. Але мы рабілі і будзем рабіць усё неабходнае і нават больш для ўмацавання абароннага патэнцыялу краіны, падтрымання баяздольнасці Узброеных Сіл на ўзроўні, які надзейна забяспечвае абарону суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці беларускай дзяржавы, — падкрэсліў беларускі лідар. — Мы больш пад бізуном і ў лапцях хадзіць не хочам і не будзем! Беларуская армія — галоўная апора, наш надзейны шчыт».


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ООО «Химтэкинвест»** (организатор торгов) извещает о проведении третьего повторного открытого **аукциона** на повышение начальной цены со снижением цены первого аукциона на 20 %
по реализации объекта недвижимости: **«Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-76236».**
Назначение: **Сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства.**
Наименование: Автомобильная заправочная станция с комплексом сервисных услуг автодороги Брест – Минск – граница РФ (11 км справа).
Расположено на земельном участке с кадастровым номером 121200000001000187 площадью 1,5531 га (Право аренды по 25.11.2104, доля 1/1)
в г. Брест, ул. Калиновая, 115. Собственник имущества – ООО «КД-Инвест» УНП 391298470, тел./факс (0214) 50-01-88.

**Начальная цена – 1 752 000 белорусских рублей.**
**Сумма задатка – 87 600 белорусских рублей.**
**Шаг торгов – 87 600 белорусских рублей.**
Цена без НДС
(НДС сверху не начисляется п. 2.30.2 ст. 115 НК РБ).
Данный лот находится в обременении в ипотеке и аренде.
Начало подачи заявок – **16 мая 2025 года 09.00.**
Окончание подачи заявок – **28 мая 2025 года 09.00.**
Заявки на участие в торгах принимаются по адресу: 211443, Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Молодежная, д. 11А, пом. 20.
Организатор торгов – ООО «Химтэкинвест», УНП 191685984.
При необходимости ознакомиться с документами и предметом аукциона, направлять запрос на электронную почту producomob2016@mail.ru или по тел. 8-0339033614.
**Начало торгов – 30 мая 2025 года в 9.00 по адресу: г. Новополоцк, ул. Молодежная, 11А, комн. 20.**

Торги проводятся при наличии двух и более допущенных к торгам участников. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. К участию в торгах допускаются физические и юридические лица, подписавшие соглашение до начала торгов об ознакомлении с предметом торгов и копиями договоров аренды; зарегистрированные в журнале регистрации заявлений; предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей, доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет руководитель); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Физическим лицам – предъявить паспорт, иной документ, подтверждающий личность.

Задаток перечисляется на р/с: номер счета (IBAN): BY13SLAN30124208400000100000 в г. Минск, ЗАО БАНК ВТБ (БЕЛАРУСЬ), код банка (BIC): SLANBY22, УНП 191685984, ООО «Химтэкинвест» до подачи Заявки на участие в аукционе, назначение платежа: «Задаток за участие в торгах по капитальному строению с инвентарным номером (указать номер)».

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней после дня проведения торгов (физическим лицам – на карт-счет, указанный при регистрации; юридическим лицам, ИП – на расчетный счет).

Участнику, выигравшему торги, задаток не возвращается и учитывается в счет оплаты предмета торгов по договору купли-продажи. Победитель торгов (либо единственный участник, давший согласие на приобретение лота), т. е. покупатель, подписывает протокол по результатам торгов в день его проведения и в обязательном порядке возмещает затраты на организацию и проведение торгов в размере **376,49 бел. руб.** в течение 5 (пяти) календарных дней после проведения торгов, а также обязан заключить договор купли-продажи с собственником предмета торгов в течение 2-х рабочих дней после проведения аукциона. Срок оплаты предмета торгов: в соответствии с заключенным договором.

В случае если к участию в торгах был допущен только один участник, он может приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов (т. е. начальная цена + 5 % + затраты на организацию и проведение торгов) путем подтверждения приобретения в день торгов.

Продавцом предоставляется отсрочка оплаты предмета аукциона 60 дней с момента переоформления имущества на покупателя.

В случае отказа или уклонения победителя торгов (или единственного участника, давшего согласие на приобретение лота) от подписания протокола и (или) договора купли-продажи, возмещения затрат, связанных с организацией и проведением торгов, результаты торгов аннулируются, внесенный им задаток возврату не подлежит, а включается в состав имущества собственника предмета торгов.

Организатор оставляет за собой право отменить аукцион без объяснения причин не менее чем за трое суток до начала его проведения.

*Ранее опубликованные объявления о предыдущих торгах: 28 декабря 2024 года, 05 февраля 2025 года, а также 09 апреля 2025 года в этом же издании.*

# ХТО НА НОВЕНЬКАГА...

## Інтрыга ў суседзяў: хто стане новым прэзідэнтам Польшчы?

**На найбліжэйшую нядзелю, 18 мая, у Польшчы прызначаны прэзідэнцкія выбары. Мяркуючы па тым, як настроены палякі, выбар ім давядзецца рабіць двойчы: на 1 чэрвеня запланавана правядзенне другога тура выбараў.**



Відавочнага лідара, за якога б абсалютная большасць аддала свае галасы, у гонцы няма. 3 масы ўсіх кандыдатаў вылучаюцца двое: Рафал Тшаскоўскі (кандыдат ад «Грамадзянскай кааліцыі» і мэр Варшавы) і Караль Наўроцкі (кіраўнік Інстытута нацыянальнай памяці і кандыдат ад партыі «Права і справядлівасць»). Ёсць і цёмны конік — трэці па рэйтынгу — Славамір Ментцэн з «Канфедэрацыі». І ў гэтай гонцы ўсё развіваецца па класічным сцэнарыі заходніх «дэмакратый»: інтрыгі, выкрыцці, скандалы...

Менш чым за тыдзень да першага тура выбараў было апублікавана апошняе апытанне палякаў, якое дэманструе значныя змены на палітычнай сцэне. І хоць лідары гонкі застаюцца ранейшымі, ёсць змены ва ўзроўні падтрымкі асобных кандыдатаў, што сведчыць: прэзідэнцкія выбары ў Польшчы 18 мая могуць быць надзвычай захапляльнымі.

Дуэт Тшаскоўскі і Наўроцкі па-ранейшаму ў авангардзе, але са стратамі. Даследаванне, праведзенае IBRiS для «Польскага радыё 24», паказвае, што мэр Варшавы можа прэтэндаваць на перамогу — яго рэйтынг 31,5 % апытаных, што ніжэй на 1,7 % у параўнанні з апытаннем, праведзеным у канцы красавіка. Другое месца займае Караль Наўроцкі. Яго вынік — 23,6 %, праўда, гэта таксама зніжэнне — на 2 %. Адкат апошняга адбываўся на фоне скандалу, спраавакаванага «забытай» кандыдатам задэклараванай кватэры. У яго штабе прызнаюць: мінулы тыдзень быў для Наўроцкага найгоршым у прэзідэнцкай кампаніі.

А вось далей самае цікавае. Крыху стаміўшыся ад гэтай парачкі, польскі электарат накіраваў свой позірк на іншых кандыдатаў, чые пазіцыі пайшлі ў рост. Так, Славамір Ментцэн з «Канфедэрацыі» набірае 12,6 %, што вышэй на 1,1 % за ранейшае значэнне. Відавочнае павелічэнне таксама адбылося ў спісах у Шымона Галаўні (8,6 %, + 2,5 %), Адрыяна Зандберга (5,4 %, + 2,2 %), Магдалены Беят (6,3 %, + 1,2 %) і іншых кандыдатаў.

Сціплае перахразмеркаванне пазіцый, але ўсё ж... Развіццё падзей па незапланаваным сцэнарыі яшчэ ніхто не адмяняў. Тым больш што апошнія дэбаты, якія прайшлі ў мінулы панядзелак, не дадалі палітычных ачкоў фаварытам гонкі.

На думку польскай прэсы, дэбаты 12 мая — найгоршыя дэбаты ў прэзідэнцкай кампаніі. Сапраўдная сварка, якая доўжылася больш за тры з паловай гадзіны, стаміла як гледачоў, так і ўдзельнікаў, не даўшы выразных адказаў на тэмы, узнятыя падчас дэбатаў.

І тут лепш працытаваць, што піша на гэты конт польская прэса:

> **«Усё пайшло не так. У сутыкненні ўсіх кандыдатаў у прэзідэнты ўсё правалілася. Была спрэчка паміж удзельнікамі і журналістамі з палітыкамі».**

Разам з тым, на думку польскіх аналітыкаў, апошнія прэзідэнцкія дэбаты не акажуць вырашальнага ўплыву на выбар палякаў каля скрынь для галасавання. Хутчэй за ўсё, першы тур прывядзе пару Тшаскоўскі — Наўроцкі да другога тура. Але! Ёсць яшчэ Славамір Ментцэн з «Канфедэрацыі», якога рана спісваць з рахункаў.

— Выбар паміж Наўроцкім і Тшаскоўскім як паміж «чумой і халерай», — рэзка адазваўся адзін з выбаршчыкаў у гутарцы з мясцовым выданнем Лукаш з Пётркуў-Трыбунальскі.

Падобна, гэта меркаванне падзяляюць многія палякі, паколькі не рвуцца брацьудзел у выбарах свайго прэзідэнта, бо не бачаць у гэтым асаблівага сэнсу. Прынамсі, такую выснову можна зрабіць з апытання, якое дэманструе чаканні ад удзелу польскага электарату ў галасаванні. Так, цэлых 51,4 % (!) рэспандэнтаў выказалі гатоўнасць галасаваць, а яшчэ 10,1 % адказалі, што «хутчэй так». У агульнай суме гэта каля 60 % грамадзян, гатовых ісці на галасаванне. Аднак траціна апытаных — ці амаль 37 % — заявілі, што не будуць галасаваць ці яшчэ не прынялі рашэнне аб гэтым. І гэта вельмі трывожны званочак для польскіх палітычных эліт, якія можа абярнуцца сур'ёзным пераразмеркаваннем пазіцый у самы адказны момант. Як гаворыцца, час пакажа.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# «КОЛЬКІ МАГЧЫМА ТРЫВАЦЬ БЕЗЗАКОННЕ І НЕСПРАВЯДЛІВАСЦЬ»

## Літоўскі палітык расказаў, чаго насамрэч хочуць жыхары гэтай краіны



**Экс-кандыдат у прэзідэнты Літвы Эдуардас Вайткус расказаў у прэс-цэнтры БелТА пра тое, што адбываецца ў яго краіне. Палітык адзначыў, што ён катэгарычна не прымае курс, які абрала кіраўніцтва дзяржавы, і што ён змагаецца за ўсталяванне ў Літве сапраўднай дэмакратыі.**

«За тое, каб Літва была вольнай і незалежнай дзяржавай, павінны змагацца мы, літоўцы. Калі мы баімся паказаць сваю пазіцыю, страцілі веру ў сваю сілу і не верым, што можна змяніць сітуацыю, яна ніколі і не зменіцца. Пытанне толькі ў тым, колькі магчыма трываць беззаконне і несправядлівасць», — заявіў ён.

Палітык падкрэсліў, што галоўнае ў яго праграме — гэта незалежнасць і свабода Літвы. Вайткус расказаў, што ў яго адрас неаднаразова паступалі пагрозы і ў сваёй краіне, у адрозненне ад Беларусі, ён не адчувае сябе ў бяспецы. Ён заўважыў, што літоўскія палітыкі ўзялі курс на тое, каб «расчалавечыць» беларускі і расійскі народы. Ён растлумачыў гэта тым, што кіраўніцтва прыбалтыйскіх краін свядома штурхае Еўропу да вайны з Расіяй.

А ў той жа час, па словах Эдуардаса Вайткуса, людзі ў Літве хочуць аднавіць цёплыя і чалавечыя адносіны паміж нашымі краінамі. І санкцыі, якія ўвяла яго краіна супраць Беларусі і Расіі, палітык назваў «выстралам у нагу». У прыклад ён прывёў Клайпедскі порт, які з-за санкцый на беларускія калійныя ўгнаенні аказаўся непатрэбным. «Гэта такі палітычны кірунак, палітычны заказ, таму эканамічныя страты не бяруцца ў разлік. Хоць гэта ва ўрон літоўскаму народу і дзяржаве. Але ў нас такая ўлада», — адзначыў Эдуардас Вайткус. Ён таксама станоўча ацаніў бязвізавы рэжым, які беларускі бок увёў для суседзяў, нягледзячы на ўсе складанасці ў цяперашніх адносінах. Па словах палітыка, гэта было вельмі правільнае рашэнне.

Журналісты спыталі, ці не апасаецца ён пасля такіх заяў вяртацца ў Літву. «Мая жонка баіцца вельмі. А я настроіўся і не баюся. Ніхто за мяне маю працу як літоўца і патрыёта Літвы не зробіць, — адзначыў Эдуардас Вайткус. — Калі ўсе баяцца, дык чаго чакаць? Літвы праз сто гадоў не стане. А я не бачу сэнсу жыцця без сваёй краіны. Без яе мы нішто. Не важна, ёсць пагроза ці не. Гэта грамадзянскі абавязак».

**Валерыя СЦЯЦКО.**


## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Экзито прайм»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 2084 | Цистерна 25 куб. м, инв № 92 | 3000,00 | 300,00 | 150,00 |
| 2085 | Емкость 25 куб. м, инв. № 93 | 3000,00 | 300,00 | 150,00 |
| 2086 | Автомобиль «Нива 21214», рег. знак. 4577 ВР-2, кузов (рама) ХТА212140А1961702, 2010 г. вып., инв. № 73 | 7080,00 | 708,00 | 354,00 |
| 2088 | Прицеп МАЗа 857100 4022 зав. № УЗМ8570090006019, рег. знак. А 1760 А-2, 2009 г. вып., инв. № 76 | 2520,00 | 252,00 | 126,00 |
| 2089 | Машина для внес. орган. удобрен. ПРТ-7А, инв. № 85 (без док.) | 7080,00 | 708,00 | 354,00 |
| 2090 | Трактор «Беларус-3022» ДЦ, инв. № 327 (без док.) | 19560,00 | 1956,00 | 978,00 |
| 2091 | Полуприцеп ПС-45, инв. № 296 (без док.) | 8040,00 | 804,00 | 402,00 |
| 2092 | Полуприцеп ПС-45, инв. № 297 (без док.) | 8040,00 | 804,00 | 402,00 |
| 2093 | Подборщик ПРФ-180, инв. № 301 | 5760,00 | 576,00 | 288,00 |
| В отношении лотов проводятся первые торги | | | | |
| **Местонахождение:** Витебская обл., Браславский р-н, аг. Межаны | | | | |
| **Дата и время проведения торгов** | **16 июня 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 | | | |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 14 мая 2025 года до 16.00 12 июня 2025 года | | | |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «Экзито прайм», проводимых 16.06.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лотам №№ 2084, 2085, 2088 – 9 %, по лотам №№ 2086, 2089, 2091–2093 – 8 %, по лоту № 2090 – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: **+375 (29) 304-25-60 Андрей (пн – пт с 09.00 до 18.00).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **Общество с ограниченной ответственностью «Экзито прайм» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. 8 (029) 576 77 15, kp@p-k.by (211969, Республика Беларусь, Витебская обл., аг. Межаны, ул. Школьная, д. 1, УНП 391883426)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

ВЕДАЙ НАШЫХ

# «ЛІЧБА» ПАД КАНТРОЛЕМ

## Беларусы занялі трэцяе месца на глабальных вучэннях па кібербяспецы ў Дубаі

Глабальныя вучэнні па кібербяспецы (Global CyberDrill 2025) арганізуюць штогод для нацыянальных груп рэагавання на камп'ютарныя інцыдэнты (CERT/CIRT/CSIRT). Сёлета ў вучэннях удзельнічала 138 каманд ад дзяржаў і арганізацый (Еўрапол). Каманда Беларусі выступала пад кіраўніцтвам Нацыянальнага цэнтра кібербяспекі і з удзелам cert.by. Арганізатарамі Global CyberDrill 2025 выступаюць Бюро развіцця электрасувязі (БРЭ), Міжнародны саюз электрасувязі (МСЭ) і Савет па кібербяспецы Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў.



Удзельнікам вучэнняў былі прапанаваны чатыры сцэнарыі для рэагавання, распрацаваныя МСЭ, контртэрарыстычным цэнтрам ААН (UNCCT), Інтэрполам і форумам каманд рэагавання на камп'ютарныя інцыдэнты (FIRST).

Па выніках мерапрыемства першае месца заняла каманда з Егіпта, другое — з Лівана, каманда з Беларусі ў выніковым заліку заняла трэцяе месца. «Мы прадэманстравалі ўзровень нашай каманды», — адзначылі ў Нацыянальным кіберцэнтры.

Як расказала ўдзельніца беларускай каманды Анастасія, спаборніцтва яе вельмі ўразіла: «Асабліва мяне здзівіла колькасць краін-удзельніц. Аб'ектыўна спадабаліся самі заданні. Важны момант — арганізатарамі спаборніцтваў з'яўляюцца такія сур'ёзныя арганізацыі, як Інтэрпол, Міжнародны саюз электрасувязі. Сапраўды, можна пераняць вопыт, пагутарыць з калегамі з іншых краін. Акрамя таго, гэта выдатная магчымасць праявіць сябе, праверыць уласныя навыкі. Паколькі ніхто загадзя не ведае, якога фармату будуць заданні, якія ў цябе будуць інструменты. Ты павінен сарыентавацца ў моманце, таму што час вельмі абмежаваны. Трэба праявіць максімум кемлівасці».

**Паводле БелТА.**

# Надвор'е на заўтра

| | | |
|---|---|---|
| МІНСК, 753 мм рт.сл. | +4..+8°C | +10..+11°C |
| ВІЦЕБСК, 751 мм рт.сл. | +3..+6°C | +10..+11°C |
| МАГІЛЁЎ, 753 мм рт.сл. | +7..+8°C | +9..+12°C |
| ГОМЕЛЬ, 753 мм рт.сл. | +8..+10°C | +10..+14°C |
| ГРОДНА, 753 мм рт.сл. | +3..+8°C | +10..+12°C |
| БРЭСТ, 757 мм рт.сл. | +4..+10°C | +10..+12°C |

Паводле даных Белгідрамета

...у суседзяў

МАСКВА +16..+18°C

С.-ПЕЦЯРБУРГ +13..+15°C

**Месяц**

*Поўня 12.05—19.05. Месяц у сузор'і Стральца.*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**

22 гадз., 01 гадз., 04 гадз., 07 гадз., 10 гадз., 13 гадз., 16 гадз., 19 гадз.

Абазначэнні:
- — няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
- — невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
- — слабая геамагнітная бура
- — малая геамагнітная бура



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

# СЯМЕЙНАЯ ЗГОДА — ШЧАСЦЕ І БАГАЦЦЕ

## Прысвячаецца Міжнароднаму дню сям'і

**По гарызанталі:** 1. ... рада вясне, а дзіця — маці *(прык.)*. 5. Для ўнука дзядуля — розум, а ... — душа *(прык.)*. 10. Тое, што і біяполе. 11. «... , праўда, немалая: // Чатыры хлопцы, тры дзяўчаці». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля». 12. Не пахмурна, а ... . 13. Дзетак гадаваць — ... гараваць *(прык.)*. 14. Так некалі называлі пазашлюбнае дзіця. 15. Травяністая паўднёвая расліна. 18. Шукайце дабро, а не ... ў паводзінах членаў сям'і *(прык.)*. 19. ... у сям'і на адной любві трымаецца *(прык.)*. 22. Той, хто неразумна траціць грошы, маёмасць. 24. «Разважлівасць бацькі ёсць самае дзейснае ... для дзяцей». Дэмакрыт. 28. Стары сасновы лес. 29. ... — дзявочая краса *(прык.)*. 30. Апошняе дзіцятка — ... *(прык.)*. 31. Вялікае ... , калі сям'я ў разладзе *(прык.)*. 32. ... — гэта шчыт для дзяцей. 33. У сям'і ..., дык і дому не рад *(прык.)*.

**По вертыкалі:** 2. Гімнастычны снарад. 3. Прылада, у якую змяшчаюць якія-небудзь дэталі. 4. ... на пары — сваты на двары *(прык.)*. 6. Пакаёвая расліна з ярка-чырвонымі кветкамі. 7. Дзіця лася. 8. ... без сям'і, што дрэва без пладоў. 9. Дзеці не ў цяжкасць, а ў ... *(прык.)*. 16. Сямейнае жыццё — гэта ... абавязкаў, заснаваная на любві *(прык.)*. 17. ... без вады мёртвая, чалавек без сям'і — пустацвет *(прык.)*. 20. «Дзеці — ... Божая». У. Караткевіч. 21. У добрай сям'і і ... бывае *(прык.)*. 23. Мужык з жонкай сварыцца — у гаршку ... варыцца *(прык.)*. 25. Тое, што асыпалася з гары. 26. Лапатачка з ручкай для захоплівання гарачай скаварады. 27. У сям'і абмеркаванне якога-небудзь пытання. 28. Салавей зашчоўкаў, значыць, ... распусцілася *(прыкм.)*.



**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ.**

**По гарызанталі:** 1. Птушка. 5. Бабуля. 10. Аўра. 11. Сямейка. 12. Ясна. 13. Век. 14. Багданька. 15. Ямс. 18. Зло. 19. Мір. 22. Мот. 24. Павучанне. 28. Бор. 29. Каса. 30. Панятка. 31. Гора. 32. Бацька. 33. Разлад.

**По вертыкалі:** 2. Турнік. 3. Касета. 4. Дзеўка. 6. Аганёк. 7. Ласяня. 8. Чалавек. 9. Радасць. 16. Школа. 17. Зямля. 20. Усмешка. 21. Вырадак. 23. Трасса. 25. Асыпак. 26. Чапяла. 27. Нарада. 28. Бяроза.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**14 МАЯ** Даты | Падзеі | Людзі

У краіне

**1814** год — нарадзіўся (г. Полацк) Каэтан Андрэевіч Касовіч, беларускі і расійскі вучоны-ўсходазнавец, член Рускага геаграфічнага таварыства. Скончыў Віцебскую гімназію, пасля — Маскоўскі ўніверсітэт. З 1850 года рэдактар навуковых работ Публічнай бібліятэкі ў Пецярбургу, прафесар Харкаўскага і Пецярбургскага ўніверсітэтаў.

**1869** год — у Мінску запушчаны першы фантан, упрыгожаны скульптурнай кампазіцыяй «Хлопчык з лебедзем». Фантан запрацаваў у скверы, закладзеным па ініцыятыве гарадскога галавы Леапольда Валянціевіча Дэльпаца і на яго ўласныя сродкі на месцы «квадратного пространства, поросшего с одной стороны травою и посещаемого коровами, а с другой занятого оврагами и ямами». Сваю назву сквер атрымаў імянным указам па капліцы Аляксандра Неўскага, якая была тут узведзена.



**1995** год — адбыліся парламенцкія выбары і рэспубліканскі рэферэндум па пытаннях мовы (рускай мове нададзены роўныя правы з беларускай), новай сімволікі, эканамічнага збліжэння з Расійскай Федэрацыяй і права Прэзідэнта распускаць парламент.

У свеце

**1796** год — англійскі сельскі ўрач Эдуард Джэнер пасля шматгадовых даследаванняў упершыню публічна прышчапіў воспу каровы чалавеку, адкрыўшы спосаб прафілактыкі натуральнай воспы.

**1900** год — у Парыжы адкрыліся II Алімпійскія гульні. У іх упершыню прынялі ўдзел жанчыны. Першай чэмпіёнкай стала брытанская тэнісістка Шарлота Купер.

**1908** год — амерыканскі пілот Уілбур Райт узяў на борт аэраплана першага ў свеце пасажыра — Чарльза У. Фэрнаса і здзейсніў палёт на 600 метраў, які доўжыўся 28,6 секунды.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10 951. Індэкс 63850. Зак. № 1047.

Нумар падпісаны ў 19.30 13 мая 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12